Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛІПЕНЯ 2012 г. СЕРАДА № 131 (27246) Кошт 1300 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

«СПОРТ — ГЭТА НАЙВЫШЭЙШЫ ЎЗРОВЕНЬ ДЫПЛАМАТЫІ»

Фота БЕЛТА.

Спартыўныя перамогі на Алімпійскіх гульнях дэманструюць поспехі развіцця дзяржавы. Аб гэтым 10 ліпеня, выступаючы на ўрачыстай цырымоніі провадаў беларускіх спартсменаў на XXX летнія Алімпійскія гульні ў Лондане, заявіў Прэзідэнт Беларусі, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка.

«Трыумф спартсмена ўзнімае краіну ў вачах сусветнай супольнасці, фарміруючы яе станоўчы імідж. Гэта дэманстрацыя поспехаў развіцця самой дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, размова ідзе не проста аб асабістых спартыўных выніках, хоць гэта таксама вельмі важна. «У Лондане вы будзеце спаборнічаць у першую чаргу за прэстыж роднай краіны, дзе ён будзе вымярацца месцамі на п'едэстале. Бо спорт — гэта найвышэйшы ўзровень дыпламатыі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што чатыры гады таму ў Пекіне беларускія атлеты хоць і не выканалі абяцанае, але прадэманстравалі высокі ўзровень майстэрства, заваяваўшы 19 медалёў. Гэта дазволіла Беларусі ўвайсці ў дваццатку вядучых спартыўных дзяржаў свету. «Але наперадзе ў вас новы і вельмі строгі экзамен. Упэўнены, у гэтай зале сабраліся тыя, хто цудоўна разумее, якая высокая місія на іх ускладзена. Людзі, для якіх слова «патрыятызм» не пусты гук», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да спартсменаў, Прэзідэнт адзначыў, што кожны раз, калі яны выходзяць на старт, за імі пільна сочаць не толькі іх родныя, але і ўсе суайчыннікі, а таксама сябры і непрыяцелі, сапернікі з усіх куткоў планеты. «На алімпійскім сходзе былі вызначаны галоўныя задачы на наступныя Гульні. Ведаю, што выканаць іх будзе неймаверна цяжка. Давяраем дзецца спаборнічаць ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі на мяжы чалавечых магчымасцяў. Аднак упэўнены, што вы дастойна здолееце ўсё пераадолець. Бо ў складзе нашай каманды адны з мацнейшых атлетаў сучаснасці, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта Кацярына Карстэн, для якой лонданская Алімпіяда стане шостай у спартыўнай кар'еры, Вікторыя Азаранка, алімпійскія чэмпіёны Раман Петрушэнка і Вадзім Махнёў, прызёры Алімпійскіх гульняў Іван Ціхан, Надзея Астапчук, Настасся Новікава і многія іншыя. Многія члены нашай спартыўнай дэлегацыі маюць вопыт выступлення на галоўных гульнях чатырохгоддзя».

Асобна Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўпершыню ў навейшай гісторыі адзіная з краін былога СССР беларуская маладзёжная зборная па футболе ва ўпартай барацьбе заваявала права ўдзельнічаць у алімпійскім турніры.

СТАР. 2

ЛЁТЧЫК-НАЗІРАЛЬНІК Уладзімір Ганчароў і пілот верталёта МІ-2 Дзяніс Зайцаў (на фотаздымку) ратуюць беларускую прыроду ад агню. У летнюю спякоту іх праца надзвычай важная і пачэсная. Як, дарэчы, і іншых спецыялістаў дзяржаўнага прадпрыемства «Беллесавія». Паветраная ахова лясоў Беларусі адсочвае пажаранебяспечныя рэгіёны, вартуе нацыянальныя паркі і заказнікі, выяўляе нават дробныя ўзгаранні, якія могуць нанесці прыродзе і народнай гаспадарцы непапраўныя страты.

КАЛІ ЛЕС У НЕБЯСПЕЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

За апошнія 8 спякотных дзён гэты экіпаж выявіў шэсць сур'ёзных узгаранняў, якія былі хутка ліквідаваны і не ўчынілі вялікай бяды. Свае палёты экіпаж выконвае з Маладзечанскай авіябазы і кантралюе надзвычай важныя экалагічныя і прыродаахоўныя аб'екты — Нацыянальны парк «Нарачанскі» і ландшафтны заказнік «Налібоцкі», больш вядомы як Налібоцкая пушча, робяць фотафіксацыю. Вось і гэтае фота пажару зроблена Уладзімірам Ганчаровым. За некалькі хвілін да чарговага палёту Д. Зайцаў і У. Ганчароў абмяркоўваюць маршрут палёту. Але гэты маршрут можа змяніцца і працягнуцца больш за 500 кіламетраў, прычым доўжыцца да трох з паловаю гадзін замест дзвюх. Усё залежыць ад наяўнасці і характару ўзгарання. Але пілотам і не прывыкаць. Пакуль будзе доўжыцца спёка, палёгкі паветраным лесапатрулям не прадбачыцца.

СТАР. 6

ЛІЧБА ДНЯ

У Беларусі мінімальная заработная плата за чэрвень 2012 года індэксуецца на 6,4 працэнта (як і за май). Гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэн за чэрвень не перавысіў пяці працэнтны парог да мая 2012 года — моманту папярэдняй індэксацыі.

Такім чынам, месячная мінімальная заработная плата (МЗП) за чэрвень складае паранейшаму Br1 млн 47 тыс. 550, пагадзінная мінімальная заработная плата — Br6 тыс. 210.

З 1 студзеня 2012 года пастановай Савета Міністраў месячная мінімальная заработная плата была ўстаноўлена на ўзроўні Br1 млн, пагадзінная мінімальная заработная плата Br5 тыс.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 27°
Віцебск	+ 25°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 25°
Магілёў	+ 27°
Мінск	+ 26°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.07.2012 г.

Долар ЗША	8390,00	▲
Еўра	10310,00	▲
Рас. руб.	254,50	▲
Укр. грыўня	1035,99	▲

«ЕДЗЕМ БІЦЦА ЗА МЕДАЛІ!»

Сур'ёзная Наста Новікава, пазітыўная Настасся Мірончык-Іванова, эфектныя Максім Мірны і Кацярына Карстэн, а таксама чырвона-руковыя гваздзікі на плошчы Перамогі — Мінск сонечным надвор'ем праводзіў у Лондан беларускіх алімпійцаў.

Да адкрыцця Алімпіяды застаецца некалькі тыдняў. Яе подых можна адчуць паўсюль: у шматтыражных газетах, грамадскім транспарце, у рэстаранах і кавярнях, дзе пад келіх піва заўзятары абмяркоўваюць шанцы Андрэя Арамнава і бравых футбалістаў Георгія Кандрацьева. Аднак найбольшая канцэнтрацыя «беларускай Алімпіяды» ўчора была на «круглай плошчы», дзе па традыцыі перад ад'ездам нашы спартсмены ўскладаюць кветкі да Вечнага агню.

Дату провадаў — 10 ліпеня — вызначылі загадзя. Адштурхоўваліся менавіта ад прысутнасці на радзіме найбольшай колькасці алімпійцаў. Не прагадалі.

СТАР. 2

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Падпіска-2012

НОВЫЯ ПРЫЗЫ — ДЛЯ НОВЫХ АДРАСАТАЎ

Учора ў сценах рэдакцыі прайшоў традыцыйны розыгрыш прызоў сярод прыхільнікаў газеты па выніках падпіскі на «Звязду» на 3-ці квартал і другое паўгоддзе 2012 года. Яе падрабязнасці і спісы пераможцаў будуць надрукаваны ў адным з бліжэйшых нумароў. Пакуль жа паведамім, што і на гэты раз вяршыцелямі лёсу ў правядзенні латарэі сталі нашы госці. Дзясяткі прызоў атрымаюць новыя адрасаты з лёгкай рукі начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Алены ПРАКАПЕНІ і інструктара-метадыста па фізічнай культуры і спорце Анастасіі МАКАРАВАЙ. Кампанію членам журы склала юная чытачка «Звязды» Ганна САЛАЎЁВА.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

BelSwissBank
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 01 июля 2012 г.	на 01 июля 2011 г.
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101		117 219,3	43 332,9
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		50 800,2	61 595,6
4	Средства в Национальном банке	1103		135 228,4	89 602,2
5	Средства в банках	1104		288 254,3	170 086,2
6	Ценные бумаги	1105		115 025,0	6 504,5
7	Кредиты клиентам	1106		72 576,7	25 080,9
8	Производные финансовые активы	1107		0,0	0,0
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		15,0	15,0
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		148 052,8	66 701,6
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		0,0	0,0
12	Прочие активы	1111		17 490,2	17 236,1
13	ИТОГО активы	11		944 661,9	480 155,0
14	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
15	Средства Национального банка	1201		31 086,1	30 428,7
16	Средства банков	1202		55 989,5	20 769,5
17	Средства клиентов	1203		602 956,5	319 139,8
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		0,0	38,4
19	Производные финансовые обязательства	1205		22,5	2 688,9
20	Прочие обязательства	1206		2 548,9	9 543,4
21	ВСЕГО обязательства	120		692 603,5	382 608,7
22	КАПИТАЛ				
23	Уставный фонд	1211		131 826,3	58 396,3
24	Эмиссионный доход	1212		0,0	0,0
25	Резервный фонд	1213		6 595,0	3 516,9
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		96 349,2	28 471,9
27	Накопленная прибыль	1215		17 287,9	7 161,2
28	ВСЕГО капитал	121		252 058,4	97 546,3
29	ИТОГО обязательства и капитал	12		944 661,9	480 155,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 июля 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.07.2012 г.	01.07.2011 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		25 061,8	4 525,0
2	Процентные расходы	2012		11 858,4	2 774,2
3	Чистые процентные доходы	201		13 203,4	1 750,8
4	Комиссионные доходы	2021		33 237,4	14 923,9
5	Комиссионные расходы	2022		5 138,2	5 051,2
6	Чистые комиссионные доходы	202		28 099,2	9 872,7
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		221,3	24 722,8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(2 054,2)	(299,5)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		26 911,0	13 213,5
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(22,5)	(3936,8)
11	Чистые отчисления в резервы	207		19 004,2	21 914,1
12	Прочие доходы	208		5 884,0	4 194,5
13	Операционные расходы	209		38 917,4	17 859,4
14	Прочие расходы	210		2 389,3	921,0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		11 931,3	8 823,5
16	Налог на прибыль	212		3 110,9	1 147,4
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		8 820,4	7 676,1

Руководитель Казбанов В. А.
Главный бухгалтер Трепашко И. И.

Лицензия Национального банка РБ на совершение банковских операций № 7 от 29.12.2008 г.

ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА КЛІМАТЫЧНЫХ ЗМЕН? ЯК УПЛЫВАЮЦЬ НА ВАША ЖЫЦЦЁ І САМААДЧУВАННЕ АНАМАЛІІ НАДВОР'Я?

Таццяна ЛАРЫНА, начальнік аддзела вытворчасці тэлевізійных праграм тэлерадыёкампаніі «Магілёў»:

— Мне здаецца, што ў цяперашнім надвор'і нічога надзвычайнага ўсё ж такі няма. Метэаролагі паведамляюць, што перакрываюцца тэмпературныя максімумы, многія з якіх былі ўсталяваны яшчэ недзе на пачатку мінулага стагоддзя. Значыць, такое ўжо было, і задоўга да нас. Іншая справа, як гэта ўплывае на наша штодзённае жыццё. Не самым лепшым чынам, калі шчыра. Экалогія пагаршаецца: нашы папярэднікі больш лёгка спраўляліся са спякотай у драўляных дамах, а мы цяпер душымся на асфальце і ў бетонных шматпавярховіках. Я здаровы чалавек, але і мяне ў спякоту напаткала мігрэнь, якой ніколі ў жыцці не было. Падае настрой, млявасць, цяжка працаваць. Што ж, трымаюся, імкнуся выконваць усе парады медыкаў, псіхалагічна настройваю сябе, а да лекаў звяртаюся толькі ў апошнюю чаргу.

Вячаслаў ШАРШУНОЎ, рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання:

— Кліматычныя катаклізмы — гэта не навуковая навіна. Чалавек уплывае істотна на прыроду, старымі і новымі тэхналогіямі, сваімі ўласнымі бескантрольнымі дзеяннямі. Аднак трэба адзначыць, што змены ў клімаце, і не толькі ў ім, на нашай планеце адбываліся здаўна: катаклізмы былі, ёсць і будуць. Але я яшчэ памятаю, калі ў нас былі марозныя зімы са снегам у два метры вышынёй, а не цяперашнія «восеньскія», шэрыя, незразумелыя. І гэтая спякота — таксама нешта ненатуральнае. Я як славянін холад пераношу лепей, чым высокія тэмпературы. Асабліва цяжка даводзіцца сардэчнікам. Я імкнуся найперш не хадзіць па сонцу: нават адмяніў днямі паездку ў любімыя Горкі. І ўвогуле стаўлюся да гэтага спакойна, па-філасофску. Нікуды ж не падзецца ад надвор'я! Але разам з тым, чалавецтву трэба задумацца над лёсам сваіх нашчадкаў. Усе гэтыя выкіды, аўтатранспарт...

Міхась КАРПЕЧАНКА, галоўны рэдактар Бялыніцкай раённай газеты «Зара над Друццю»:

— Усё пазнаецца ў параўнанні: горшай падзеі ў маім жыцці, чым тэхнагенная аварыя ў Чарнобылі, не было, бо я страціў сваю радзіму. Так што кліматычныя анамаліі на такім фоне не здаюцца мне такімі страшнымі. Хоць я вельмі метэазалежны і з цяжкасцю пераношу як гарачыню, так і моцныя маразы. Цяпер ад спякоты ратуюся халоднай вадой. У нас ёсць чытач у Дзівашычах, які патрабуе, каб наша раёнка друкавала спіс неспрыяльных дзён. Гэта яму дапамагае ў жыцці, у неспрыяльны час ён не выходзіць з дому. Як і ў спякоту... Але сам я ўсё ж такі зрабіў ахвяру: паехаў у гарачыню ў Полацк, дзе раней, сорамна сказаць, ніколі не быў. Вытрымаў!

Запісала Ілона ІВАНОВА.

ISSN 1990 - 763X

ЗА ПАРУШЭННЕ ПАРАДКУ РЭАГАВАННЯ НА КРЫТЫКУ Ў СМІ Ў ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАКАРАНЫ 12 КІРАЎНІКОЎ

Пра гэта паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

КДК ажыццяўляе пастаянны кантроль за выкананнем патрабаванняў Указа «Аб рэагаванні службовых асоб на крытычныя выступленні ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі». Толькі па выяўленых у першым паўгоддзі гэтага года фактах парушэнняў прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці 12 кіруючых работнікаў арганізацый Глыбоцкага, Гарадоцкага, Мёрскага, Сенненскага і Талачынскага раёнаў, а таксама Віцебска.

КДК Віцебскай вобласці звяртае ўвагу кіраўнікоў арганізацый і прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці, што невыкананне без уважлівых прычын палажэнняў указа цягне прымяненне да кіраўнікоў арганізацый мер дысцыплінарнай адказнасці, аж да вызвалення ад займаемых пасад.

БЕЛТА.

ПРЭЗІДЭНТ ЗАПРАСІЎ АРМЯНСКІХ БІЗНЭСМЕНАЎ БОЛЬШ АКТЫЎНА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У РЭАЛІЗАЦЫІ ІНВЕСТПРАЕКТАЎ У БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ажыццявіў сімвалічны запуск першай у краіне лініі па разліве армянскага каньяку 10 ліпеня ў час наведвання прадпрыемства СТАА «Армянскі стандарт» у Мінску.

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт у свой час, сустракаючыся з групай армянскіх прадпрымальнікаў, закрануў пытанне аб неабходнасці рэалізацыі некалькіх сумесных праектаў. Два гады таму ў Ерэване быў адкрыты Беларускі гандлёвы дом, а цяпер у беларускай сталіцы адкрылася вытворчасць па разліве армянскага каньяку. Абодва праекты ўдачныя, і гэта, на думку кіраўніка беларускай дзяржавы, сведчыць аб неабходнасці пашырэння інвестыцыйнай прысутнасці краін.

Заснавальнікамі мінскага прадпрыемства выступаюць Ерэванскі каньячна-вінна-гарэлачны камбінат і рэспубліканскае вытворча-гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Беларусьгандаль» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Доля армянскага боку ў статутным фондзе складае 69 працэнтаў, беларускага — 31 працэнт. Пад размяшчэнне новай вытворчасці была выканана рэканструкцыя будынка па завулку Веласіпедны, 6, пастаўлена лінія італьянскай фірмы, завезены 16 металічных эмаліраваных рэзервуараў для захоўвання каньяку. Вытворчыя магутнасці разлічаны на выпуск 200 тыс. дал у год. На прадпрыемстве ўстаноўлена сучаснае абсталяванне, сістэма захоўвання, якая адпавядае ўсім стандартам, ажыццяўляецца жорсткі лабараторны кантроль. Сыравіна для вытворчасці паступае з Арменіі. Плануецца, што з новай лініі будзе ісці ў гандлёвую сетку трох- і пяцізоркавы каньяк.

Паводле заключэння спецыялістаў, на сёння гэта лепшы каньяк у Беларусі.

Звяртаючыся да сузаснавальніка прадпрыемства Гагіка Царукяна, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Ты чалавек слова: сказаў — зрабіў. Важна, каб нашы чыноўнікі такім людзям заўсёды давалі зялёнае святло».

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхналагічным працэсам і сістэмай кантролю якасці прадукцыі. «Армянскаму каньяку на Беларусі быць», — падагульніў Прэзідэнт. «Беларусы гэтага не забудуць. Гэта першая вытворчасць у нашай краіне армянскіх каньякоў», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Звяртаючыся да Гагіка Царукяна, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што неабходна развіваць, павялічваць вытворчасць у краіне і запрасіў бізнэсмена больш актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі інвестпраектаў у Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«СПОРТ — ГЭТА НАЙВЫШЭЙШЫ ЎЗРОВЕНЬ ДЫПЛАМАТЫІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Хачу, каб вы разумелі, што ў спорце ўсё бывае. Але толькі не на Алімпійскіх гульнях. Да Алімпійскіх гульняў чалавек рыхтуецца і рыхтуе ўсе рэзервы, якія ў яго ёсць. І «ўсё» быць не можа, можа быць толькі перамога. За гэтым кожны спартсмен туды едзе, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Так, удзельнічаць добра, але галоўнае не ўдзел, а перамога. Вось вам мой наказ ад імя беларускага народа».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў алімпійцам, каб яны выступілі дастойна, зрабіўшы тое, што яны ўмеюць, пакінуўшы ў баку хваляванне. «Вы павінны навучыцца берагчы сябе ад залішняга псіхалагічнага націску. Калі вы гэта зробіце, вы выйграеце і прывезяце тыя медалі, якія ад вас чакае краіна», — даў наказ Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што высока цэніць кожнае паспяховае выступленне спартсменаў і работу трэнераў. «Дзяржава для вас зробіць усё. Заваюйце гэтыя ўзнагароды і перад вамі ў нашай краіне будуць раскрыты ўсе дзверы, у тым ліку і да Прэзідэнта», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама ўручыў спартсменам дзяржаўныя ўзнагароды за высокае прафесійнае майстэрства і выдатныя спартыўныя дасягненні. У тым ліку ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджана беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка. Ганаровага звання «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» удастоены галоўны трэнер алімпійскай зборнай каманды Беларусі па футболе Георгій Кандрацьеў.

Вікторыя Азаранка падарыла кіраўніку дзяржавы сваю тэнісную ракетку.

Затым алімпійскі чэмпіён сцяганосец XXIX летніх Алімпійскіх гульняў Аляксандр Раманькоў перадаў Аляксандру Лукашэнку Дзяржаўны сцяг, які Прэзідэнт уручыў капітану алімпійскай каманды Кацярыне Карстэн.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў, каб на Алімпійскіх гульнях усім спадарожнічала ўдача, а вянцом працы сталі ўзняцце Дзяржаўнага сцяга і выкананне гімна краіны: «Помніце аб тым, што вы куяце славу роднай Беларусі».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«ЕДЗЕМ БІЦЦА ЗА МЕДАЛІ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спартсмены ва ўрачыстых строях прадстаўлялі амаль усе віды спорту, у якіх Беларусь будзе задзейнічана на лонданскай Алімпіядзе. Сярод іх — і наша алімпійская надзея ў цяжкай атлетыцы **Настасся Новікова.**

— Настрой у мяне баявы і да Алімпіяды стаўлюся адказна, — дзеліцца прыўзнятым настроем з карэспандэнтам «Звязды» Новікава. — На памост выходжу 30 ліпеня, а вылятаю ў Лондан за два дні да спаборніцтваў. Умовы да падрыхтоўкі? Па папярэдніх Алімпіядах магу сказаць, што яны будуць добрыя. Што нам трэба? Толькі памост і штанга. Безумоўна, трэнер сочыць за вынікамі супернікаў. Аднак галоўнае — тое, колькі трэба падняць у выніку.

Дарэчы, вялікую карзіну з рознакаляровымі хрызантэмамі да помніка паднеслі капітан і сцяганосец нашай алімпійскай зборнай Кацярына Карстэн і Максім Мірны.

— Тры-чатыры тыдні таму я даведалася, што буду капітанам алімпійскай зборнай Беларусі, — прызналася **Кацярына Карстэн, двухразовая алімпійская чэмпіёнка па веславанні.** — Для мяне гэта вельмі прыемна, але і вельмі хвалююча. Я нават казала, што, можа, не трэба, бо казаць прамовы — гэта не маё. Я лепш гонку прайду. Але ўсё роўна прыемна, што выпаў падобны гонар. У мяне зараз узмоцненыя трэніроўкі. Рыхтавалася ў Брэсце, Германіі, а 15-га накіруюся ў Лондан. З англійскай вадой я знаёмая. У нас там праходзіў чэмпіянат свету. Канал знаходзіцца ў полі, дзе вельмі моцны бакавы вецер, і гэта непакоіць. Але спецыяльна для мяне змайстравалі лодку пад гэтыя старты.

Для **Максіма Мірнага** Лондан будзе не першай алімпійскай сталіцай. Толькі да чарговай Алімпіяды ён не ставіцца як да шэраговых спаборніцтваў, а рыхтуецца сур'ёзна.

— Гэта апошняя генеральная рэпетыцыя перад выездам у Лондан, — разважае пра мерапрыемства Максім, які ў тэнісных спаборніцтвах выступіць у парным турніры ў дуэце з Аляксандрам Бурым. — І прысутнасць Прэзідэнта на провадах (у Палацы Рэспублікі. — **Аўт.**) падкрэслівае тое, што ў нашай краіне вельмі сур'ёзнае стаўленне да спорту, алімпійскай зборнай. Усе атрымалі наказ, зарад энергіі і гатовы прыступіць да справы.

— Вы — сцяганосец беларускай зборнай. Гэта дадаткова стымулюе?

— Так, несці сцяг краіны, алімпійскай каманды — гэта вялікі гонар. І я хачу зрабіць усё дастойна, каб з гонарам прэзентаваць нашу краіну.

— Максім, вам ужо 35, аднак зараз вы дэманструеце даволі добры вынік. Можа, і ў наступнай Алімпіядзе паўдзельнічаеце?

— Для таго, каб гэта адбылося, трэба спачатку і з гэтай справіцца. Гіпатэтычна падобнае магчыма, але гэта будучыня. Усе сілы, эмоцыі, азарт хочацца накіраваць менавіта на бліжэйшы месяц.

Тарас ШЧЫРЫ.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ ЗАКОН АБ АМНІСТЫІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 ліпеня падпісаў закон «Аб амністыі некаторых катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынствы». Тэкст адпаведнага нарматыўнага прававога акта зарэгістраваны 10 ліпеня ў Нацыянальным рэестры прававых актаў, паведамляе БЕЛТА.

Як паведамлялася, дакумент прадугледжвае, што за ўчыненне злачынстваў, якія не адносяцца да цяжкіх, будуць амнісціраваны непаўналетнія; цяжарныя жанчыны; жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў; асобы пенсійнага ўзросту; інваліды 1-й і 2-й групы; хворыя на актыўныя формы туберкулёзу, аднесеныя да 1-й, 2-й, 5-й «А» або 5-й «Б» груп дыспансэрнага ўліку; анкалагічныя хворыя 2-й, 3-й і 4-й клінічных груп; ВІЧ-інфіцыраваныя з 3-й (прэ-СНІД) і 4-й (СНІД) стадыямі захворвання па клінічнай класіфікацыі СА-АЗ; ветэраны баявых дзеянняў і іншыя.

Таксама прадугледжваецца вызваленне ад пакарання асуджаных за крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваенне або растрату, крадзяжы шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі, за злачынствы супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, за злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі. Але пры гэтым на дзень уступлення ў сілу закона яны павінны адбыць не менш за адну чвэрць назначанага тэрміну.

Акрамя таго, могуць быць вызвалены асобы, у якіх на дзень разгляду матэрыялаў аб прымяненні амністыі да заканчэння тэрміну пакарання застаецца менш за адзін год і іншыя.

Пры гэтым, як і раней, не падлягаюць амністыі асобы (у тым ліку і тыя, якія падпадаюць пад катэгорыі, названыя ў іншых артыкулах законапраекта), якія асуджаны за ўчыненне злачынстваў, што ўяўляюць вялікую грамадскую небяспеку. У тым ліку гэта злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, супраць дзяржавы, супраць жыцця і здароўя, супраць палавой недатыкальнасці. Амнісціраваны не будуць і тыя, у дачыненні да каго прымянялася амністыя або памілаванне ў перыяд з 2005 па 2012 год; на тых, хто на дзень уступлення прыгавору ў сілу не кампенсаваў эканамічны ўрон за ўчыненае (акрамя льготнай катэгорыі); тых, чыё пакаранне ў выглядзе смяротнага пакарання было заменена пажыццёвым зняволеннем і інш. Амністыя не закране злосна парушаючых парадак у папраўчых установах, а таксама дапусціўшых асабліва небяспечны рэцыдыў злачынстваў.

У цэлым чакаецца, што амністыя закране каля 7,6 тыс. чалавек. Амаль 2 тыс. з іх плануецца вызваліць непасрэдна з месц пазбаўлення волі. Усяго ў Беларусі ўтрымліваецца каля 37 тыс. зняволеных.

Камунальшчыкі рыхтуюцца да зімы

Лета ў разгары, а камунальшчыкі, у адпаведнасці з прымаўкай, рыхтуюцца да ацяпляльнага сезона 2012-2013. І абяцаюць забяспечыць нам камфортныя ўмовы пражывання і адсутнасць істотных праблем восенню і зімой.

Як заявіў на прэс-канферэнцыі **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Анатоль ШАГУН,** цяпер у краіне ствараюцца запасы паліва, ідзе падрыхтоўка да зімы цепласетак, водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі, жыллёвага фонду. Акрамя таго, рыхтуецца абсталяванне, прыборы ўліку, каб у ацяпляльны перыяд забяспечыць карэктнае выстаўленне грамадзянам платы за жыллёва-камунальныя паслугі.

Асобная ўвага надаецца нарыхтоўцы мясцовых відаў паліва. Што тычыцца водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі, то цяпер праводзіцца прафілактычнае абслугоўванне і рамонт артэзіянскіх свідравін, водаправодных сетак, воданапорных вежаў і калонак. Гэтыя работы, па словах намесніка міністра, выкананы амаль на 40%.

Па стане на 4 ліпеня 2012 года завершана работа па выпрабаваннях абсталявання 2 335 кацельняў і прыкладна 11 тыс. км цепласетак, што складае 73% ад плана. Паралельна з выпрабавальнымі працамі вядзецца прафілактычны рамонт абсталявання кацельняў. Палова кацельняў ЖКГ ужо прайшла яго.

Жыллёвы фонд падрыхтаваны на ўзроўні 40-50% ад запланаванага аб'ёму работ. У прыватнасці, адрамантавана прыкладна 53% стыкаў сценавых панэляў. Работы па стрэхах выкананы на 39% ад гадавога плана. «Сёлета рамонту дахаў перашкаджалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я ў чэрвені, з-за якіх адзначалася некаторае адставанне ад плана, — сказаў Анатоль Шагун. — Цяпер тэмпы работ значна выраслі».

У цэлым, па словах намесніка міністра, на выкананне ўсіх работ па падрыхтоўцы да зімы з улікам капітальнага рамонту жылога фонду спатрэбіцца каля 1,5 трлн рублёў. Для фінансавання работ будуць прыцягнуты розныя крыніцы. Дзесьці 60% ад гэтай сумы складуць сродкі мясцовых бюджэтаў і часткова рэспубліканскага (для асобных энергазберагальных мерапрыемстваў). Каля 500 млрд рублёў — сродкі прадпрыемстваў і крэдытныя рэсурсы. Яшчэ прыкладна 40-42 млрд рублёў — адлічэнні грамадзян на капітальны рамонт.

Святлана БУСЬКО.

У ТЭМУ ДНЯ

Беларусь пакуль не можа адмовіцца ад часовага адключэння гарачага водазабеспячэння летам.

Такое адключэнне неабходна для правядзення выпрабаванняў цеплавых сетак, а таксама абсталявання цеплапунктаў. Згодна з тэхрэгламентам, пасля адключэння і непасрэдна перад правядзеннем выпрабаванняў цепласетка павінна астыць (на гэта патрабуецца каля сутак). Затым праводзяцца выпрабаванні павышаным ціскам, падчас якіх цеплаенергасбыт таксама падаваць нельга. Як правіла, падчас выпрабаванняў павышаным ціскам выяўляюцца скрытыя дэфекты ў трубаправодах.

Дапамагчы скараціць тэрміны адключэння гарачага водазабеспячэння можа прымяненне сучасных матэрыялаў у цеплазабеспячэнні. У прыватнасці, труб з пашытага поліэтылену, тэрмін службы якіх больш доўгі. Да таго ж яны не схільныя да карозіі, таму няма неабходнасці выпрабоўваць іх штогод.

А для таго, каб цалкам адмовіцца ад адключэнняў, трэба змяніць сістэму цеплазабеспячэння населенага пункта, даўшы магчымасць пераключэння асобных раёнаў на іншую крыніцу цеплазабеспячэння ці іншую цеплавую магістральную сетку.

■ Зваротная сувязь

ДЗЕНЬ З МІНІСТЭРСТВАМ ПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі пачынае новы праект «Дзень з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны», які стартуе 12 ліпеня ў Маладзечне.

Сустрэчы з працоўнымі калектывамі прадпрыемстваў і насельніцтвам, асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб кіраўнікамі міністэрства, правядзенне кансультацый спецыялістамі міністэрства, тэматычных «прамых тэлефонных ліній», праца электроннай прыёмнай — такія кірункі ўключае гэты шырокамаштабны праект.

У першай акцыі праекта прыме ўдзел **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА,** якая сустрэнецца з працоўнымі калектывамі ААТ «Маладзечанскі малочны камбінат», падведамасных устаноў, наведае шматдзетную сям'ю.

У гэты ж дзень у Маладзечанскім райвыканкаме з 11.00 да 12.30 правядзе прыём грамадзян, індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб **намеснік міністра Валерый КАВАЛЬКОЎ.** Запіс на прыём па тэл. (0176) 73-85-28 да 13.00 11 ліпеня.

Адначасова з 10.00 да 12.00 ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Маладзечанскага райвыканкама (вул. Прытыцкага, 5) спецыялісты ўсіх ключавых упраўленняў міністэрства будуць кансультаваць грамадзян па пытаннях сацыяльна-працоўнай сферы. Прыём ажыццяўляецца без запісу ў парадку чарговасці.

Святлана БУСЬКО.

ПАКАТАЎСЯ НА ТРАКТАРЫ...

У Верхнядзвінскім раёне міліцыя шукала трактар, які сагналі літаральна з поля

Пра начны згон «МТЗ-82» у раённы аддзел унутраных спраў паведамілі з адміністрацыі сельскагаспадарчага прадпрыемства. Трактар, дарэчы, сагнаць было не цяжка, бо кабіну кіроўца не зачыніў, больш за тое — ён чамусьці пакінуў ключ ад замка запальвання. Трактар стаяў на полі паблізу вёскі Кавалёўшчына. Раніцай гэты трактар у тэхнічна спраўным стане знайшлі. Высветлілася, што пакатаўся на жалезным кані 21-гадовы рабочы гэтага ж прадпрыемства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛОНДАНЦАЎ АБУРЫЛА БАТАРЭЯ СПА, ЯКУЮ ВАЕННЫЯ РАЗМЯШЧАЮЦЬ НА ДАХУ ІХ ДОМА НАПЯРЭДАДНІ АЛІМПІЯДЫ

Жыхары Лондана, на дахах дамоў якіх плануецца размясціць зенітна-ракетныя комплексы для забеспячэння бяспекі правядзення Алімпіяды-2012, звярнуліся ў Вярхоўны суд, патрабуючы адмены гэтага плана. Яны адзначаюць, што рашэнне, прынятае Міністэрствам абароны, парушае іх права на павагу прыватнага жыцця і жылля, прадугледжаныя Еўрапейскай канвенцыяй па правах чалавека, а таксама падвяргае рызыцы стаць мішэнню для тэрарыстаў, паведамляе агенцтва АР.

РАСІЯ АДПРАЎЛЯЕ ДА БЕРАГОЎ СІРЫІ КАРАБЕЛЬНУЮ ГРУПУ

Вялікі супрацьлодкавы карабель «Адмірал Чабаненка» і тры вялікія дэсантныя караблі выйшлі ў аўторак з Североморска і ўзялі курс да берагоў Сірыі, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на ваенна-дыпламатычную крыніцу. Паводле яе звестак, да караблёў Паўночнага флоту пазней далучыцца вартавы карабель Балтыйскага флоту «Яраслаў Мудры» і дапаможныя судны. Ён таксама адзначыў, што на борце караблёў знаходзяцца падраздзяленні марской пяхоты Паўночнага флоту. Крыніца падкрэсліла, што паход атрада праходзіць у адпаведнасці з планамі баявой падрыхтоўкі ВМФ і ён не звязаны з абвастрэннем сітуацыі ў Сірыі. Адзначым, што цяперашні паход расійскіх караблёў пачаўся праз некалькі дзён пасля весткі аб тым, што ва ўсходнюю частку Міжземнага мора накіроўваецца карабельная група НАТА ў складзе нямецкага, турэцкага і французскага фрэгатаў. Па афіцыйнай інфармацыі, місія носіць антытэрарыстычны характар, але мяркуецца, што тым самым НАТА хоча прыстрашыць Дамаск. Падставай, мяркуючы па ўсім, стала абвастрэнне адносін паміж Стамбулам і Дамаскам пасля таго, як сірыйскія СПА збілі самалёт-разведчык ВПС Турцыі RF-4E.

КАБ ЖЫЦЬ ДОЎГА, ТРЭБА СЯДЗЕЦЬ ЯК МАГА МЕНШ

Седзячы на адным месцы, чалавек тым самым скарачае сабе жыццё. Паводле даследавання, вынікі якога надрукаваў British Medical Journal, калі паменшыць колькасць гадзін, выдаткаваных на сядзенне, да паказчыка менш чым тры гадзіны за дзень, то працягласць жыцця павялічыцца на два гады. А калі глядзець тэлевізар не больш за дзве гадзіны ў дзень, то можна пражыць амаль на 1,4 года даўжэй, сведчаць вынікі даследавання, якое абапіраецца на статыстычныя даныя 2005-2009 гадоў і ахоплівае 167000 чалавек. Прааналізаваўшы сабраную інфармацыю, спецыялісты змаглі вылічыць індэкс, які адлюстроўвае рызыку смерці ў сувязі з сядзячым ладам жыцця. Так, паказчык смяротнасці ад прычын, звязаных з доўгім сядзеннем, склаў 27%, а любоў да тэлевізара адпавядала 19%.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ГЕРМАНІЯ ЗАПЛАЦІЦЬ САВЕЦКІМ ЯЎРЭЯМ, ЯКІЯ ВЫЖЫЛІ Ў ВАЙНУ

Германія пагадзілася вылучыць прыкладна 300 мільёнаў долараў на выплату кампенсацый 80 тысячам яўрэяў, якія перажылі вайну на тэрыторыі СССР. Як піша Jerusalem Post, раней большасць гэтых людзей не атрымлівала нямецкіх кампенсацый, у адрозненне ад яўрэяў заходняй і цэнтральнай Еўропы.

Перамовы ад імя пацярпелых падчас вайны вяла арганізацыя Claims Conference. Яўрэям, якія выратаваліся ад нямецкіх войскаў, будзе выплачана аднаразовая кампенсацыя ў 3150 долараў. Заяву на атрыманне гэтых грошай можна будзе афармліць сёлета да 1 лістапада. Як адзначае выданне, раней яўрэі краін Усходняй Еўропы, якія не ўваходзяць у ЕС, былі пазбаўлены такой магчымасці.

Акрамя таго, Германія пагадзілася зраўняць сумы штомесячных выплат выжыўшым у вайне яўрэям з Усходняй і Заходняй Еўропы. Цяпер яны будуць атрымліваць прыкладна па 370 долараў у месяц.

Немцы таксама пагадзіліся знізіць патрабаванні для прэтэндэнтаў на кампенсацыю. Раней атрымальнік дапамогі павінен быў хавацца ад нацыстаў як мінімум год. Зараз для гэтага хопіць і паўгода.

Як паведамлялася раней, у 2008 годзе Германія пагадзілася выплаціць кампенсацыі яўрэям, якія перажылі блакаду Ленінграда.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ — НА ПРЫБОРКУ ДРЭЎ

На Віцебшчыне два дні запар бушаваў ураган. 9 ліпеня ў выніку моцнага ветру парывамі да 15 метраў у секунду без электрычнасці засталіся 143 населеныя пункты.

Акрамя таго, падчас разгулу стыхіі ў Віцебскім раёне былі пашкоджаны дахі жывёлагадоўчай фермы і сямі жылых дамоў, у Лёзненскім — дахі трох жылых дамоў, трох жывёлагадоўчых фермаў, трох складоў, аднаго дзіцячага садка. Пацярпелых няма. У Мёрскім і Пастаўскім раёнах работнікамі МНС ажыццяўлялася прыборка аварыйных дрэў з праезнай часткі. Моцны вецер паваліў дрэвы і ва Ушацкім, Талачынскім, Бешанковіцкім, Сенненскім, Верхнядзвінскім раёнах.

Паводле інфармацыі «Віцебскэнерга», для падключэння электразабеспячэння былі задзейнічаны 15 аварыйных брыгад (15 адзінак тэхнікі, 50 чалавек).

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МАРШРУТ АЎТОБУСУ «ПРАКЛАДАЮЦЬ» З АРБІТЫ

Аўтаматызаваная сістэма дыспетчарскага ўпраўлення перавозкамі пасажыраў у рэгулярных зносінах знайшла сваё ўкараненне ўжо больш чым у 50 гарадах — у падведамасных Мінтрансу аўтатранспартных арганізацыях. Бартавое абсталяванне маюць больш чым 5,1 тысячы аўтобусаў, паведамілі ў прэс-службе міністэрства.

Нагадаем, што радыёнавігацыйная апаратура, якой абсталёўваюцца аўтобусы, знаходзіцца на сувязі з арбітальнымі спадарожнікамі сістэмы глабальнага пазіцыянавання і з абсталяваннем, што размешчана ў дыспетчарскім пункце. Укараненне вышэйназванай сістэмы дазваляе, у прыватнасці, атрымаць эфект за кошт аўтаматызацыі кантролю адхіленняў ад вызначаных маршрутаў і графікаў следавання аўтобусаў, працягласці працоўнага дня кіроўцы і часе выкарыстання аўтатранспарту, хуткасных рэжымаў руху і пройдзенага транспартным сродкам шляху.

З «РЫБАЛКІ» — У КАЛОНІЮ

Суд Верхнядзвінскага раёна прыгаварыў грамадзяніна П. да пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год і шэсць месяцаў у папраўчай калоніі агульнага рэжыму — за незаконную здабычу рыбы і нанясенне навакольнаму асяроддзю шкоды ў буйным памеры. Гэты грамадзянін стаўнымі сеткамі вылавіў 230 асобін розных відаў рыбы.

Суд Расонскага раёна вынес свой прысуд грамадзяніну С. — пазбавіць волі тэрмінам на два гады ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму. Гэты грамадзянін сёлета здабываў стаўнымі сеткамі рыбу ў перыяд забароны на яе лоўлю. Здабычай браканьера сталі 123 асобіны розных відаў рыбы агульнай вагой 16 кілаграмаў. Навакольнаму асяроддзю была нанесена шкода ў асабліва буйным памеры — больш чым на 14 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю намесніка начальніка Апарату Прадстаўніцтва Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі **Шалюты Аляксандра Елісеевіча** і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў глыбока смуткуюць у сувязі з заўчаснай смерцю намесніка начальніка Апарату Прадстаўніцтва Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі **Шалюты Аляксандра Елісеевіча** і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «Центроэнергомонтаж»

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7
Наименование и местонахождение эмитента	Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7
Цель приобретения акций	Для последующей продажи инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом акционерного общества
Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук)	**18** 000
Цена приобретения (белорусские рубли)	**173 000**
Сроки, форма и порядок расчета	Оплата производится в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций.
Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций	г. Минск, переулок Велосипедный, д. 7
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	**с 12 июля** 2012 **года по 21** сентября 2012 **года**
Даты начала и окончания покупки акций	с 23 сентября 2012 **года по 30 сентября** 2012 **года**

УНП 100092167

Диплом об окончании Мозырьского политехнического техникума АN№ 042422 на имя Шевко Геннадия Валерьевича считать недействительным.

Извещение о проведении 10 августа 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Гродноопторг»

Предмет торгов (наименование, характеристики и начальная цена предмета торгов с учетом НДС)	- здание гаража общей площадью 272,3 кв.м; - технологическая площадка площадью 1 680 кв.м; - ограждение протяженностью 140 п/м; - ворота распашные. Начальная цена – 384 262 895 бел. рублей.	**Сумма задатка, руб.** 38 426 300
Сведения о земельном участке	Имущество, входящее в состав предмета торгов, расположено на земельном участке с кадастровым номером 423685400024000001, назначение – обслуживание производственной территории	
Местонахождение продаваемого имущества	Гродненская область, Лидский район, Третьяковский с/с, в районе дер. Долина (территория СЭЗ «Гродноинвест», 0,7 км от Лидской окружной городской дороги).	
Сведения о продавце	ОАО «Гродноопторг», 230001, г. Гродно, ст. Лососно, телефоны: (0152) 55 39 12, (044) 566 00 54, (044) 566 00 45	
Сведения об организаторе аукциона	Управляющий по делу о банкротстве ОАО «Гродноопторг» ЧП «Корпорация Антикризисного Управления» телефоны: (0152) 55 39 12, (044) 566 00 54, (044) 566 00 45	

Продаваемое имущество имеет обременения. За подробной информацией обращаться к продавцу.

Возможно банковское кредитование при покупке данного имущества.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, резиденты Республики Беларусь, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического лица, а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок по 07.08.2012 включительно на расчетный счет № 3012127410010, в Региональной Дирекции № 400 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Гродно, код 153001369, получатель – ОАО «Гродноопторг», УНП 500013881.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи.

Аукцион состоится **10 августа 2012 года в 12.00** по адресу: г. Гродно, ст. Лососно, актовый зал. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.07.2012 по 07.08.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ст. Лососно (административное здание).

Ознакомление с предметом торгов осуществляется по предварительному согласованию с продавцом.

Телефоны для справок: (0152) 52 46 01, (0152) 55 39 12, (044) 566 00 54, (044) 566 00 45.
Сайты в интернете: www.kay.by, www.opttorg.grodno.by

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

11 ліпеня 2012 г. № 13 (285)

СЕСІЯ

Ці ёсць рэзервы ў турызму?

Аграсядзіба не павінна асацыявацца з хатай у вёсцы або месцам для начлегу — да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі выязной сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Пытанне аб рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання, структурных падраздзяленняў аблвыканкама і абласных арганізацый па стварэнні ўмоў для развіцця турысцка-экскурсійных паслуг і аграэкатурызму разгледжана падчас выязной сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў у Нясвіжы.

— Гэтая тэма не новая. І ў Беларусі, і ў сталічнай вобласці ёю займаюцца вельмі шчыльна, — адзначыла старшыня аблсавета Святлана Герасімовіч. — На Міншчыне зарэгістравана 339 аграсядзіб, 324 з іх дзейнічаюць. Створаны яны і ў Нясвіжскім раёне. А для свайго пасяджэння мы выбралі гэты рэгіён менавіта таму, што тут ёсць усе ўмовы, каб стаць лідарам у галіне турызму і агратурызму. Горад мае багатую гістарычна-культурную спадчыну, найпрыгажэйшую прыроду, неабходную інфраструктуру. Наша мэта — выявіць рэзервы, якія не задзейнічаны, і актывізаваць работу на месцах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На погляд Святланы Міхайлаўны, пакуль яшчэ недастаткова створана аб'ектаў на базе сельгасарганізацый. У Нясвіжскім раёне нямала эканамічна моцных прадпрыемстваў, што выпускаюць якасную і экалагічна чыстую прадукцыю, якая запатрабавана турыстамі і гасцямі. Чым больш аграсядзіб, тым лепш вырашаецца праблема занятасці насельніцтва. Акрамя таго, гэта і добрая магчымасць прадаць уласныя сувеніры, выпечку, малако.

— У горадзе робіцца ўсё неабходнае, каб госці адчувалі сябе ўтульна і камфортна, — сказаў старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван Крупко. — У прыватнасці, сёлета адкрылі піцэрыю, а таксама кавярню і рэстаран побач з палацам Радзівілаў. Будуюцца і дадатковыя аўтастаянкі.

Варта дадаць, што ў горадзе ўзводзіцца праваслаўны храм, вядзецца рэстаўрацыя касцёла Божага Цела. Летась распачата рэстаўрацыя паркавага комплексу Нясвіжа, які займае 119 гектараў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗА ЗНОС... НЕ Б'ЮЦЬ У НОС

З 1 верасня спросцяцца працэдуры па ўліку і скарачэнні пустуючага і старога жылля ў сельскай мясцовасці.

Бываючы па службовых і асабістых справах у сельскай мясцовасці, кожны раз адзначаю для сябе, як змяняецца вонкавы выгляд вёсак. Тым большым «дысанансам» на агульным фоне выглядаюць хаты з пустымі або пазабіванымі аканіцамі, напаўразабранымі дахамі і сценамі, падворкам, на якім буяе пустазелле вышынёй у чалавечы рост...

Такіх хат у кожным раёне не адзін дзясятак назбіраецца. Гаспадары даўно памерлі, спадчыннікі раз'ехаліся хто куды... Будынкі ж стаяць, навяваючы сваім выглядам зусім не аптымістычныя думкі. Іх бы, на добры лад, знесці — ды толькі, як той казаў, хутка казка расказваецца, ды не хутка справа робіцца. Дом, якім бы ні быў — гэта прыватная ўласнасць, а з ёю жарты дрэнныя. Перш чым зрабіць на такую ўласнасць «замах», выканаўчая ўлада павінна выканаць шэраг працэдур, вызначаных адпаведным заканадаўствам: знайсці гаспадароў і ў выпадку іх адмовы ад уласнасці правесці справу праз суд... Часам працэс зацягваецца не тое што на месяцы — на гады. Каб не завязнуць у заканадаўчых лабірынтах, некаторыя кіраўнікі сельвыканкамаў без усялякіх пошукаў і папярэджанняў, на свой страх і рызыку... пускаюць стары дом пад бульдозер, руйнуюць яго з зямлёй, такім радыкальным спосабам выказваючы сваё адмоўнае стаўленне да занадта складанага ў сэнсе выканання Указа № 70, які рэгулюе адпаведныя працэдуры.

Аднак у хуткім часе сітуацыя са скарачэннем колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці павінна палепшыцца: на змену Указу № 70 прыходзіць (з 1 верасня гэтага года) Указ № 100. Менавіта ён павінен спрасціць працэдуру зносу «непрэзентабельнай» маёмасці, дапамагчы зэканоміць час і нервы работнікам выканаўчых органаў улады.

— Парадак уліку і скарачэння колькасці пустуючых і старых дамоў, вызначаны Указам № 70, як і звязаныя з гэтым працэсуальныя працэдуры, сёння відавочна састарэлі. Некаторыя нормы гэтага ўказа ўжо не адпавядаюць ні заканадаўству аб ахове і выкарыстанні зямлі, ні заканадаўству аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, — кажа **начальнік управаўлення прававой і кадравай работы Дзяржкамітэта па маёмасці Аляксандр САВІН.**

Галоўная перавага Указа № 100 («Аб захадах па ўдасканаленні ўліку і скарачэння колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці») заключаецца ў спрашчэнні працэдуры ў цэлым, скарачэнні шэрагу непатрэбных прамежкавых «крокаў», дакладным вызначэнні часовых межаў. Калі, скажам, раней сельвыканкам павінен быў некалькі разоў інфармаваць уласніка пра тое, што яго дом можа быць адабраны ў судовым парадку, ці цяпер, у адпаведнасці з новым указам, дастаткова будзе аднаго такога папярэджання.

Таму ўладальнікам нерухомасці лепш не даводзіць сітуацыю да крытычнай адзнакі. Тым больш што зрабіць гэта зусім не складана — **дастаткова адзін раз на тры гады паведаміць у мясцовы выканкам пра свой намер выкарыстоўваць дом для пражывання...** А вось адсутнасць такога паведамлення, а таксама выкарыстоўванне жылога дома менш за 1 месяц на год на працягу 3 апошніх гадоў запар могуць прывесці да таго, што дом прызнаюць пустуючым.

— Самі крытэрыі вызначэння дома як пустуючага носяць крыху суб'ектыўны характар, — пагаджаецца Аляксандр Савін. — Суду патрэбны сведчанні суседзяў, а яны ж могуць і памыляцца, і даваць непраўдзівую інфармацыю... У любым выпадку, калі будзе недастаткова падстаў для таго, каб прызнаць дом пустуючым, суд стане на бок грамадзяніна і адмовіць сельвыканкаму ў іску. Калі суд усё ж прызнае дом пустуючым, значыць, гэты факт быў даказаны і не выклікаў ніякіх сумненняў.

Пустуючыя дамы ўлічваюцца ў спецыяльным рэгістры, які вядзе мясцовы выканаўчы орган. Уласніку жылога дома пра ўключэнне яго «нерухомасці» ў рэгістр паведамляюць загадзя, заказным пісьмом. Атрымаўшы такое пісьмо, грамадзянін можа адправіць у адказ паведамленне пра свой намер (калі такі з'явіцца) выкарыстоўваць дом. У гэтым выпадку будынак у рэгістр не ўключаецца.

Калі ж уладальнік праігнаруе папярэджанне, дом уключаць у рэгістр. Пасля гэтага сельвыканкам мае права падаць заяву ў суд — аб прызнанні дома безгаспадарным і перадачы яго мясцоваму органу ўлады, а таксама аб спыненні права ўласнасці на зямельны ўчастак. Уласніку абавязкова паведамляюць аб падачы такой заявы ў суд. І калі ён усё ж не захоча страчваць маёмасць, то можа прыняць удзел у судовым пасяджэнні.

— Калі **пустуючы** дом — гэта цалкам нармальны, моцны дом, дзе проста ніхто не жыве, то **стары** дом — гэта будынак, які не адпавядае санітарным і тэхнічным нормам, або з'яўляецца непрыдатным для пражывання, — кажа Аляксандр Савін. — Якія варыянты ёсць у гаспадароў старога дома? Яны могуць або знесці дом, або аднавіць яго для выкарыстання. На ўсё пра ўсё ўладальніку даецца 6 месяцаў, аб чым яму павінны паведаміць пісьмова.

Тэрмін гэты цалкам прымальны. І калі грамадзянін за гэты час усё ж не вызначыцца з лёсам дома, то пачнецца працэдура яго адабрання і перадачы ў камунальную ўласнасць праз суд. Гэту «апошнюю інстанцыю» абмінуць ці «скараціць» немагчыма, лічыць Аляксандр Савін.

— Вось знясём дом без судовага разбору, а потым з'явіцца былы гаспадар і заявіць, што ў яго там залатая печка была. І запатрабуе ад улады кампенсацыю!

З усяго сказанага вышэй можна зрабіць яшчэ адну выснову: кампетэнцыя па вызначэнні лёсу пустуючых і старых дамоў будзе па максімуме перададзена на ўзровень сельвыканкамаў. Гэта датычыцца і падачы заявы ў суд, і наступнага прыняцця рашэння аб зносе ці продажы пустуючага будынка. Толькі... хто яго купіць? Асабліва ў глыбінцы? Вось і атрымліваецца, што займацца старымі і пустуючымі дамамі для мясцовай улады эканамічна нявыгадна. Матэрыяльных і фінансавых выдаткаў шмат, а выгада — пад вялікім пытаннем.

Ёсць прапановы перасяляць у жылыя дамы, якія перайшлі ў дзяржаўную ўласнасць у сельскай мясцовасці, злосных неплацельшчыкаў камунальных паслуг. З іншага боку, ці палепшыць гэта маральны мікраклімат у сельскай мясцовасці?

Ва Указе № 100 не прапісана, якім чынам дзяржава будзе выкарыстоўваць атрыманыя ва ўласнасць пустуючыя дамы. Аднак сэнс у расходаванні дзяржаўных грошай (на працэдуру пошуку ўладальнікаў, улік, знос і г.д.) усё ж павінен быць. І пра гэта варта падумаць асобна.

— У любым выпадку Указ № 100 добры ўжо тым, што дапаможа зэканоміць час і сродкі сельвыканкамаў з аднаго боку і павысіць адказнасць непасрэдна ўласнікаў з другога, — лічыць Аляксандр Савін.

Наталля КАРПЕНКА.

СУР'ЁЗНЫЯ ГУЛЬНІ

Дарослыя справы маладых парламентарыяў

Леанід ЛАХМАНЕНКА

Сёння моладзевая палата пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў уяўляе сабой, на жаль, адзіны прыклад моладзевага парламентарызму ў Беларусі. Палата стала адначасова і школай вырашэння злабадзённых праблем для маладых мінчан. Ёсць усе падставы для распаўсюджвання гэтай цікавай формы работы ўвогуле ў краіне.

Так, у нас не першы год існуюць школьныя парламенты, дзіцячыя ролевыя парламенцкія гульні і г.д. Але так, як працуюць дэпутаты з моладдзю ў Мінскім гарсавеце — з рэальнымі альтэрнатыўнымі выбарамі, з правядзеннем парламенцкіх сесій, работай пастаянных камісій, прыняццем рашэнняў і наступнай іх рэалізацыяй у маштабах горада, прысутнасцю на сесіях гарадскога Савета, пакуль можна ўбачыць толькі ў мінскай палаце. Яе галоўнае адрозненне ў тым, што работа палаты максімальна набліжаная да дзейнасці Савета: яе прадстаўнікі сядзяць на тых жа месцах, што і дэпутаты, карыстаюцца тым жа дэпутацкім рэгламентам і г.д. Каардынуе дзейнасць палаты з боку гарсавета Юрый Чачукевіч, старшыня пастаяннай камісіі Савета па моладзевай палітыцы і сувязях з грамадскімі арганізацыямі. Сам яшчэ даволі малады чалавек, ён як куратар палаты імкнецца гэтае даручэнне выконваць з усёй адказнасцю.

— Мэтай стварэння палаты ў 2007 годзе стала неабходнасць мець у горадзе пляцоўку, дзе б маладыя людзі не толькі выказвалі свае прапановы, ідэі, думкі, але і былі б пачутыя мясцовай уладай, службамі Мінгарвыканкама і кіраўніцтвам раённых адміністрацый. Тут трэба зрабіць адну істотную заўвагу: моладзевая палата — гэта не вынаходніцтва Мінгарсавета, а творча пераасэнсаваны, адаптаваны і перанесены на сталічную глебу замежны досвед, у асноўным расійскі, у рабоце з моладдзю.

Моладзевая палата, каб быць такой па змесце, павінна адказваць тром міжнародным крытэрыям. Галоўнае — выбарнасць на альтэрнатыўнай аснове. Дарэчы, выбары ў палату праходзяць у два этапы. Першы: прыём заявак, знаёмства электарату на сайце з прэтэндэнтамі на месца ў палаце, іх праграмамі дзеянняў, біяграфіяй, фотапартрэтам, відэазваротам, выбары ва ўсіх акругах Мінска. У кожнай акрузе звычайна было ад 4 да 8 заявак, з іх пасля адбору заставаліся аўтары трох самых цікавых заявак. Другі этап: прамыя выбары. У вызначаны дзень ва ўсіх школах адбыліся выбары па ўсіх правілах: са скрынямі для бюлетэняў, тайным галасаваннем, наступным падлікам галасоў. У выбарах удзельнічалі ўсе ахвотныя хлопцы і дзяўчаты. Тыя з кандыдатаў, хто набраў большасць галасоў па сваёй акрузе, станавіліся членамі палаты, — расказвае Юрый Чачукевіч.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
Цептер Банк

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2012 г.

ЗАО «Цептер Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2012	01.07.2011
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	19 456,1	4 785,7
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	67 919,1	21 225,2
5	Средства в банках	1104	63 941,7	125 586,3
6	Ценные бумаги	1105	107 626,4	2 483,9
7	Кредиты клиентам	1106	202 057,4	108 729,6
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	22 953,1	10 813,7
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	5 388,5	1 561,9
13	ИТОГО активы	11	489 342,3	275 186,3
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	8 727,1	7 558,4
16	Средства банков	1202	10 019,0	10 710,2
17	Средства клиентов	1203	197 447,3	69 946,9
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	31 578,1	22 632,2
19	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
20	Прочие обязательства	1206	933,6	107 891,9
21	ВСЕГО обязательства	120	248 705,1	218 739,6
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	149 487,0	42 030,0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	7 474,4	2 101,5
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	14 332,0	1 306,3
27	Накопленная прибыль	1215	69 343,8	11 008,9
28	ВСЕГО капитал	121	240 637,2	56 446,7
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	489 342,3	275 186,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ с 1 января 2012 г. по 30 июня 2012 г.

ЗАО «Цептер Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.01.2012-30.06.2012	01.01.2011-30.06.2011
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	32 995,3	7 797,5
2	Процентные расходы	2012	21 177,7	2 408,9
3	Чистые процентные доходы	201	11 817,6	5 388,6
4	Комиссионные доходы	2021	4 480,2	1 481,9
5	Комиссионные расходы	2022	552,9	629,0
6	Чистые комиссионные доходы	202	3 927,3	852,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(4,9)	14,2
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	2 265,6	9 440,9
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(647,5)	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(1 818,9)	7 131,7
12	Прочие доходы	208	132,5	140,6
13	Операционные расходы	209	12 718,7	5 266,6
14	Прочие расходы	210	3 148,9	1 502,4
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	3 441,9	1 936,5
16	Налог на прибыль	212	-	478,3
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	3 441,9	1 458,2

Председатель Правления Дворников Игорь Андреевич
Главный бухгалтер Нестерова Галина Чеславовна
Дата подписания «06» июля 2012 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2011 № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214, БИК 153001820.

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

ЖЫЛЬЦЫ — СУПРАЦЬ!

Неадназначная сітуацыя склалася вакол вымушанага перасялення

Барыс ПРАКОПЧЫК

Дом па вуліцы Пестрака 34-А быў пабудаваны ў 1987 годзе. Звонку ён нічым не адрозніваецца ад дзясяткаў іншых падобных шматпавярховікаў у Гродне, ды і ў іншых рэгіёнах краіны. Так, зусім не «прыгажун», як мадэрнізаваныя апошнім часам падобныя будынкі «са стажам», але і не скажаш, што ў заняпадзе знаходзіцца. Прынамсі, на сустрэчы, дзе абмяркоўвалася сітуацыя вакол гэтага дома, ад жыльцоў неаднойчы гучала: «Наша жыллё нас цалкам задавальняе і мы не патрабуем ніякага рамонту!»

Зрэшты, пра гэту сустрэчу — ніжэй, а спачатку праблема, у тым выглядзе, як яна бачыцца жыльцам дома. Яны звярнуліся з ёю ў рэспубліканскія і мясцовыя дзяржаўныя інстанцыі, а таксама накіравалі лісты ў сродкі масавай інфармацыі.

З-за чаго сыр-бор?

З ліста ў рэдакцыю:

«Хочам на старонках вашага выдання выказаць крыўду і роспач. На сёння сітуацыя складваецца такім чынам, што адміністрацыя жыллёва-камунальнага падраздзялення «Гроднажылбуда», на балансе якога значыцца наш дом, высяляе нас. Выганяюць дзясяткі сем'яў з кватэр, у якіх людзі жылі па 10-20 гадоў. Мы шмат гадоў гадавалі ў гэтым доме дзяцей, працавалі і адпачывалі, радаваліся і сумавалі, планавалі будучыню, увогуле жылі добра, як жывуць мільёны беларускіх грамадзян. За ўсе гэтыя гады людзі неаднаразова рабілі рамонты ў кватэрах, укладваючы свае сілы і сродкі, акуратна аплачвалі камунальныя паслугі, у тым ліку і адлічэнні на капітальны рамонт будынка. І вось дачакаліся... Рамонту? Рэканструкцыі? Перадачы дома на баланс горада?

Многія прадпрыемствы г. Гродна, маючы на балансе дамы падобнага тыпу, перадалі іх гораду без высялення людзей, што там пражываюць. Пры гэтым не ламаліся іх лёсы, ніхто не адбіраў у і без таго небагатых людзей родны кут, дзяржава не пакідала людзей з іх бядой і адчаем. І толькі чыноўнікі «Гроднажылбуда» робяць з людзей ізгояў, адмахваюцца ад іх ...»

Дык з-за чаго ж разгараўся гэты сыр-бор? З чым звязана неабходнасць перасялення, да якога прымушаюць жыльцоў дома? І што ім прапануецца ўзамен?

Вось меркаванне, якое выказваецца ў скаргах жыльцоў:

— «Неабходнасць» рэканструкцыі прадыктавана перш за ўсё добрым тэрытарыяльным размяшчэннем дома ў мікрараёне з развітай інфраструктурай. Дом можна выгадна прадаць. Але ўзамен звычайных адна-двухпакаёвых кватэр з асобнай кухняй, санвузлом нам прапануюць перабрацца... у інтэрнат блочнага тыпу з агульнай кухняй на ўвесь паверх — у значна горшыя ўмовы, у якіх многія з нас у свой час ужо нямала пажылі. Атрыманне жылля па вуліцы Пестрака, 34-А мы ўспрымалі як паляпшэнне жыллёвых умоў. А цяпер што, назад да гаршка?

Намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гроднажылбуд», дырэктар жыллёва-камунальнага падраздзялення гэтага прадпрыемства Аляксандр Грыгор'еў катэгарычна абвяргае падазрэнні ў нейкай асабістай выгадзе ў дачыненні да гэтага дома: «Пры разглядзе пытання далейшага выкарыстання будынка, які знаходзіцца ў камунальнай уласнасці Гродзенскай вобласці, не ўзнікала пытанне яго камерцыйнага продажу».

А наконт статусу дома, далейшых перспектыў гэтага будынка і яго цяперашніх жыльцоў Аляксандр Грыгор'еў патлумачыў наступнае. Дзесяцідвярховы будынак па вул. Пестрака, 34-А складаецца са 120 аднапакаёвак і 40 двухпакаёвак і з самага пачатку мае **статус інтэрната для маласямейных**. І пры засяленні, ды і потым людзям паведамлялася, што ім прадастаўляюцца жылыя памяшканні ў інтэрнаце, прызначаныя для часовага пражывання... «Гроднажылбудам» па меры магчымасцяў праводзіліся бягучыя рамонты месцаў агульнага карыстання, даху, камунікацый. Аднак сёння з-за працяглага тэрміну эксплуатацыі будынак патрабуе сур'ёзнага рамонту з заменай інжынернага абсталявання і некаторых канструкцый, для чаго і патрабуецца адсяленне жыльцоў.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Выканаюць рэканструкцыю — і потым удзячныя за паляпшэнне ўмоў людзі вернуцца ў сваё жыллё? Не, такі варыянт ім не прапануецца. Сітуацыя іншая. Па інфармацыі Аляксандра Грыгор'ева, усім жыльцам прапанавалі будаваць кааператыўныя кватэры — з ільготным крэдытаваннем, незалежна ад месца працы і чарговасці на паляпшэнне жыллёвых умоў. Па ўзгодненні з мясцовай уладай у 2010—2011 гадах былі сфарміраваны і пабудаваны два кааператыўныя дамы. Такі варыянт задаволіў 48 сем'яў: яны пабудаваліся ў складзе ЖБСК і спакойна пакінулі дом па вул. Пестрака, 34-А. Праўда, некаторыя жылыя памяшканні так і не вызваліліся: дзеці перабраліся ў кааператыўныя кватэры, а бацькі засталіся на ранейшым месцы.

Частку жыльцоў перасялілі ў іншыя інтэрнаты, частка была выселена ў сувязі з наяўнасцю ў іх іншага жылля ў горадзе. А астатнім, хто па тых ці іншых прычынах адмовіўся стаць забудоўшчыкам у ЖБСК, спецыяльна створаная камісія прапанавала варыянты перасялення ў іншае жыллё — у адпаведнасці з цяперашнім складам сям'і і заканадаўствам, зазначае Аляксандр Грыгор'еў. Праўда, не ўсе з'явіліся на прыём, некаторыя адмовіліся падаць неабходныя дакументы па складзе сям'і, а ў шэрагу выпадкаў пісьмовую згоду на перасяленне людзі хоць і далі, аднак фактычна не перасяляюцца. Таму фарміруюцца дакументы для іх перасялення ў судовым парадку, паведаміў Аляксандр Грыгор'еў.

Што ж датычыцца далейшага лёсу будынка па вул. Пестрака, то рашэннем аблвыканкама ад 21 сакавіка г.г. гэты дом павінен перайсці з абласной у гарадскую ўласнасць — з яго выкарыстаннем пасля рэканструкцыі пад сацыяльнае і арэнднае жыллё.

Дарэчы, у Гродне ёсць практыка і іншага падыходу да лёсу падобных інтэрнатаў. Напрыклад, у «Гроднапрамбудзе» інтэрнаты кватэрнага тыпу па вуліцы Томіна вырашылі перавесці ў статус дамоў дзяржаўнага жылога фонду. Гэты працэс аказаўся вельмі складаным і працяглым, але, тым не менш, ён падыходзіць да завяршэння. «Нікога мы не высялялі!» — паведаміла кіраўнік службы прававой і кадравай работы гэтага прадпрыемства Эла Міравая.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЖЫЛЬЦЫ — СУПРАЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Што далей?

Сустрэча першага намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама Юрыя Шулейкі з жыльцамі адбылася вечарам у двары будынка. У размове таксама ўдзельнічаў Аляксандр Грыгор'еў, а аўтар гэтых радкоў занатоўваў думкі і прапановы, што выказваліся. Надвор'е, як на заказ, выдалася цудоўнае, але гэта зусім не палепшыла атмасферу сустрэчы. Як і можна было прадбачыць, эмоцыі часам зашкальвалі, абстаноўка была напружанай і нервовай.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Дом у вельмі дрэнным стане і патрабуе капітальнага рамонту? Гэты аргумент выклікаў на сустрэчы масу пярэчанняў з боку жыльцоў. Вось, напрыклад, пазіцыя Ніны Седач:

— Наш дом не аварыйны і нам не патрэбны нейкія паляпшэнні. Можам нават даць распіскі, што жыллё нас цалкам задавальняе і мы не патрабуем ніякай рэканструкцыі. Многія з нас, доўгія гады пражываючы тут, неаднаразова рабілі рамонт, мянялі сантэхніку, клалі на падлогу лінолеум, ламінат, мы за свае грошы ўстанаўлівалі шклопакеты, дзверы ў пад'ездах з дамафоннай сістэмай, у калідорных пралётах... І цяпер наша сям'я, не маючы прэтэнзій па аплаце за жыллё, павінна перабрацца ў інтэрнат блочнага тыпу?

Пры гэтым, лічаць жыльцы, атрымліваецца парадокс. На працягу доўгіх гадоў, па сутнасці, усіх задавальняла, што жыльцы, як і ў звычайных кватэрах, вельмі многае рабілі за свой кошт. А вось цяпер, калі паўстала пытанне перасялення з-за змены статусу дома, не толькі не вядзецца размовы пра нейкую кампенсацыю жыльцам іх затрат, дык яны яшчэ і аказаліся вінаватымі ў тым, што «перастараліся» ў забеспячэнні нармальных умоў свайго пражывання. Маўляў, што за свавольствы ў інтэрнаце?.. Дык, можа, трэба было не праяўляць ніякай ініцыятывы, нічога не ўдасканальваць і працягваць жыць у такіх жа ўмовах, як 20 гадоў таму?

Людзі, якія прыйшлі на гэтую сустрэчу, — самага рознага ўзросту, у тым ліку моладзь і пенсіянеры. Сярод іх не толькі цяперашнія работнікі ААТ «Гроднажылбуд», але і тыя, хто не мае працоўных адносін з гэтым прадпрыемствам. Такіх сярод наймальнікаў у гэтым доме таксама шмат. Ды інакш, пэўна, за доўгія гады скласціся і не магло. Людзі працавалі на прадпрыемстве і па тых ці іншых прычынах пакідалі яго, сем'і ствараліся і распадаліся, павялічваліся і скарачаліся... І хіба ж людзі вінаватыя ў тым, што домам пачалі «актыўна займацца», пры гэтым, аднак, не робячы «стаўку» на цяперашніх жыльцоў?

Увогуле з агульнымі меркамі да жыльцоў гэтага дома не падыйсці. Адна справа, калі чалавек трымаецца за гэта жыллё, маючы іншае, і нават здае яго ў наём (здаралася і так), тым самым парушаючы заканадаўства. Безумоўна, кожны такі выпадак павінен быць разгледжаны згодна з законам. Аднак зусім іншая справа, калі чалавек не з'яўляецца парушальнікам жыллёвага заканадаўства і сапраўды не мае іншых варыянтаў, акрамя як трымацца за жыллё ў доме па вул. Пестрака, 34-А.

Дарэчы, нядаўна адміністрацыя ААТ «Гроднажылбуд» звярнулася ў аблвыканкам з просьбай дазволіць пазачарговае ўключэнне грамадзян, якія зарэгістраваны ў гэтым інтэрнаце і стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, у склад новага ЖБСК. Некаторыя жыльцы інтэрната, якія не скарысталіся ранейшымі прапановамі па будаўніцтве кааператыўных кватэр, сёння ўжо пагаджаюцца. Але ж ёсць і людзі, чые фінансавыя магчымасці, нават на льготных умовах, не дазваляюць стаць забудоўшчыкамі ў ЖБСК. І яны не згодны пераязджаць у іншы інтэрнат. Напрыклад, жанчына, у якой дачка-інвалід першай групы, катэгарычна супраць мяняць цяперашнія ўмовы на тыя ж два пакоі, але з агульнай кухняй: «Як дзіця будзе сябе адчуваць, калі навокал — чужыя людзі?». Вельмі заклапочана і студэнтка: «Цяпер у мяне свой пакой, дзе рыхтуюся да заняткаў. І калі мы з бацькам і маці трапім у адзін пакой, дзе мне займацца?»

Яшчэ адзін варыянт, акрамя будаўніцтва кааператыўнага жылля, — каб у адзін з пад'ездаў дома па вул. Пестрака, 34-А пасля рэканструкцыі зноў засяляліся яго цяперашнія жыльцы, але ўжо ў якасці арандатараў. З адпаведным хадайніцтвам адміністрацыя «Гроднажылбуда» звярнулася да мясцовых улад. Аднак, мяркуючы па рэакцыі жыльцоў на сустрэчы, гэты варыянт наўрад ці мае перспектыву, бо за арэнднае жыллё прыйдзецца плаціць значна больш, чым яны плацяць цяпер.

Пагаварылі і разышліся? Пэўна, гэту сустрэчу ўсё ж нельга назваць марнай. І, верагодна, яна не апошняя. На думку першага намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама Юрыя Шулейкі, сітуацыя складаная, неардынарная, патрабуецца вельмі ўважлівы падыход да кожнай канкрэтнай сітуацыі.

— Ніводнае незаконнае дзеянне супраць вас не зроблена. Вывучаюцца ўсе вашы меркаванні, праблема, якая існуе. І я прыехаў не для таго, каб вас абразіць, прынізіць і пазбавіць жылля. Вывучым сітуацыю, прапрацуем яшчэ некалькі варыянтаў, і зноў выйдзем на сустрэчу з вамі, — паведаміў жыльцам Юрый Шулейка.

Дарослыя справы маладых парламентарыяў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Летась адбыліся выбары ў палату 3-га склікання. Прычым, заўважце, на альтэрнатыўнай аснове — на 57 месцаў прэтэндавалі больш за 1500 маладых людзей. Лічба 57 зусім не выпадковая. Менавіта столькі дэпутатаў у Мінскім гарадскім Савеце. Важная рыса апошніх выбараў у палату: пашырэнне, калі так можна казаць, яе сацыяльнага складу. Раней, у двух папярэдніх выбарчых кампаніях, удзельнічалі толькі вучні старэйшых класаў гарадскіх школ. Цяпер і студэнты першага і другога курсаў сталічных ВНУ сталі членамі палаты.

Другі крытэрый — палата павінна працаваць пры якім-небудзь органе прадстаўнічай улады. У Мінску яна, нагадаем, дзейнічае пры гарсавеце. Так што з гэтым крытэрыем усё нармальна.

Трэці крытэрый — павінен існаваць дакладны механізм рэалізацыі рашэнняў палаты, якія прымаюцца. Такі механізм быў выпрацаваны. Пры палаце існуе 5 пастаянных камісій, якія ахопліваюць асноўныя сферы моладзевых інтарэсаў і праблем. У прыватнасці, камісіі па валанцёрскім руху; здаровым ладзе жыцця; па культурным адпачынку і г.д. У камісіях прапановы моладзі праходзяць «абкатку», затым паступаюць у прэзідыум палаты.

Вось прыкладны шлях ажыццяўлення канкрэтнага рашэння палаты. У свой час у яе паступіла прапанова павялічыць у горадзе колькасць пляцовак для заняткаў экстрэмальнымі відамі спорту: катанне на роліках, скейтбордынг і г. д. Праблема была яшчэ і ў тым, што маладыя людзі займаліся гэтым у асноўным побач з вядомымі помнікамі і манументамі сталіцы: на плошчы Якуба Коласа, каля стэлы «Мінск — горад-герой». Месцы не зусім прыстасаваныя, мякка кажучы, для такіх хлапчуковых заняткаў. Таму палатай было пастаўлена пытанне перад гарадскімі ўладамі аб стварэнні такіх пляцовак — каб у кожным раёне была як мінімум адна пляцоўка. Гэтае рашэнне разглядалася на сесіі гарсавета і пры чарговым зацвярджэнні бюджэту сталіцы ў ім былі выдаткаваны сродкі на арганізацыю такіх пляцовак. Сёння ўжо ў некаторых мінскіх раёнах, пасля таго, як іх адміністрацыі пераканаліся ў карысці такіх месцаў адпачынку моладзі, ёсць ужо па 5 і больш пляцовак.

Акрамя гэтага, Юрый Чачукевіч можа звярнуцца ў Мінгарвыканкам з дэпутацкім запытам наконт рэалізацыі таго ці іншага рашэння палаты. Але да гэтага справа рэдка даходзіць. У многім дзякуючы таму, што старшыня Мінскага гарадскога Савета Міхаіл Савановіч часта сустракаецца з прадстаўнікамі палаты, ведае іх настроі, жаданні, памкненні. Асобныя з прапаноў палаты Міхаіл Фёдаравіч бярэ пад асабісты кантроль, спрыяе іх ажыццяўленню. Між іншым, першая яго сустрэча з прадстаўнікамі палаты новага склікання адбылася ў гарадской ратушы ва ўрачыстай і адначасова дзелавой абстаноўцы. Там яму было зададзена шмат пытанняў, што закраналі моладзевыя праблемы. А каб у маладых не было завышаных патрабаванняў, каб яны рэальна ацэньвалі рэаліі гарадскога бюджэту, прадстаўнікоў палаты запрашаюць на сесіі гарсавета — цудоўная магчымасць убачыць на свае вочы «кухню» прыняцця рашэнняў, размеркавання бюджэтных сродкаў, якіх заўсёды не хапае.

— Што значыць для гарсавета палата? — пытаюся ў яго старшыні.

— Яна для нас з'яўляецца своеасаблівым каналам зваротнай сувязі з моладзевым асяроддзем. Мы можам з першых рук даведвацца аб настроях мінскіх юнакоў і дзяўчат, а з іншага боку, праз членаў палаты спрабуем даводзіць свае падыходы, меркаванні. Для ўсталявання большага ўзаемапаразумення мы практыкуем прыкладна раз на квартал сумесныя выязныя семінары на адным з вядучых прадпрыемстваў сталіцы, у прыватнасці, у Парку высокіх тэхналогій, «Мінск-Арэне», Белкамунмашы і іншых. Каб юнакі і дзяўчаты бачылі, як развіваецца горад, куды ўкладваюцца велізарныя рэсурсы. Палата выбіраецца тэрмінам на 2 гады, гарсавет на 4 гады. За час нашых паўнамоцтваў мы працуем з двума скліканнямі палаты, — гаворыць Міхаіл Фёдаравіч. Паводле яго слоў, гэта робіцца для таго, каб даць большай колькасці маладых людзей прайсці рэальную школу дачынення да прадстаўнічай улады.

> **«Наспеў час распаўсюдзіць практыку выбрання моладзевых палат у абласных цэнтрах краіны.**

Як вядома, у нас любяць шмат гаварыць аб моладзі, аб тым, што яна «наша будучыня», «наша ўсё» і г. д. Але як часта з-за аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын далёка не ўсюды даходзяць рукі, каб рабіць нешта істотнае, карыснае для хутчэйшага сталення маладых, загартоўкі іх лідарскіх якасцяў (зразумела, у тых, у каго яны ёсць), для далейшага паступовага прыцягнення да палітычнага жыцця краіны, у прыватнасці, удзелу ў выбарчых кампаніях.

Вось такі характэрны прыклад. Вучняў старэйшых класаў даўно турбавала пытанне аб немагчымасці ўдзельнічаць у некалькіх прадметных алімпіядах на працягу аднаго года. Праблема была ў наступным. Згодна з палажэннем, кожны школьнік меў права ўдзельнічаць штогод толькі ў адной алімпіядзе, скажам, толькі па матэматыцы. Паралельна праявіць свае веды ў алімпіядзе па фізіцы ці замежнай мове ўжо забаранялася. Чаму, навошта гэтыя штучныя абмежаванні? Такая несправядлівасць, вядома, абурала маладых. І аднойчы палата ўзняла гэту праблему: спачатку перад мінскімі ўладамі (ад іх яны атрымалі падтрымку), потым перад органамі рэспубліканскага кіравання, у прыватнасці, Міністэрствам адукацыі. Пытанне некалькі разоў абмяркоўвалася на розных узроўнях, і нарэшце было вырашана на карысць школьнай моладзі. Сёння ў яе ёсць права ўдзельнічаць у некалькіх прадметных алімпіядах.

Юрый Чачукевіч гаворыць, што моладзевы парламентарызм даволі распаўсюджаны ў свеце, а таму нярэдкія кантакты маладых мінчан з замежнымі калегамі, напрыклад, з прадстаўнікамі Савета Еўропы і Моладзевага парламента Масквы. Зразумела, вельмі карыснымі былі сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якія ўзбагачаюць абодва бакі: моладзь — веданнем работы, так бы мовіць, дарослых палат, а парламентарыяў — магчымасцю хоць крышачку ўнікнуць у сутнасць праблем сучаснай моладзі. А таму наспеў час распаўсюдзіць практыку выбрання моладзевых палат у абласных цэнтрах краіны. Увогуле можна ўжо распачаць падрыхтоўчую работу па стварэнні ў Мінску Цэнтра моладзевага парламентарызму.

А тое, што гэтая ідэя мае пад сабой трывалую глебу, сведчыць хаця б такі факт: у гарсавет па досвед дзейнасці палаты ўжо звярталіся калегі з Мінскага і Гродзенскага абласных Саветаў, гарадскіх і раённых Саветаў розных рэгіёнаў.

ПРАВЕРЫЎ НА ГЕРМЕТЫЧНАСЦЬ...

У Баранавічах пенсіянер ранкам вырашыў самастойна замяніць газавы балон. А пасля праверыць герметычнасць злучэння пры дапамозе... адкрытага полымя.

— Натуральна, газапаветраная сумесь паміж рэдуктарам і балонам успыхнула. У выніку гаспадар дома, 75-гадовы мужчына, атрымаў тэрмічныя апёкі рук, грудной клеткі першай-трэцяй ступеняў. Пацярпелага шпіталізавалі ў Баранавіцкую гарадскую бальніцу №1.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ці ёсць рэзервы ў турызму?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Сёлета пастараемся давесці да ладу Стары парк. А да 2015 года паэтапна добраўпарадкуем астатнія, — заўважыў Іван Крупко. — Актыўна рэстаўруецца і летняя рэзідэнцыя Радзівілаў — парк «Альба». Перш наперш тут за кошт сродкаў ад правядзення мясцовых суботнікаў і абласнога бюджэту расчышчаем каналы, паколькі ў сажалках павышаецца ўзровень вады, і ў выніку адбываецца пераўвільгатненне глебы, гінуць унікальныя дрэвы.

Знайшоўся і інвестар, які выказаў намер узяць паркавы масіў у арэнду на 90 гадоў і ўкласці сродкі ў яго развіццё, у стварэнне аграсядзіб, забаўляльных атракцыёнаў і аб'ектаў.

Усяго ў раёне дзейнічае 9 аграсядзіб. Удзельнікі сесіі наведалі адну з іх — «Пляшэвічы», што знаходзіцца на базе закрытага акцыянернага таварыства «1 Мая». Госці з Расіі і Ізраіля ўжо ацанілі комплекс паслуг, якія тут прапаноўваюцца. Для пражывання — камфартабельныя дамкі з кухняй і душам. Ёсць сталовая, саўна, більярд. Побач невялікі вадаём, лес. Да паслуг ахвотных — шацёр на 80 месцаў, дзе можна ладзіць розныя ўрачыстасці, мерапрыемствы, вяселлі.

— За мінулы год выручка склала 100 млн рублёў, — заўважыў дырэктар таварыства Анатоль Рудзяк. — Работнікам гаспадаркі адпачынак абыдзецца на 50% танней, чым прыезджым.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На думку спецыялістаў, на Міншчыне варта больш увагі надаваць так званаму падзейнаму турызму. З кожным годам ён становіцца ўсё больш папулярным. У Валожынскім раёне праводзяцца спаборніцтвы па ездавым спорце на сабачых запрэжках, у гарадскім пасёлку Івянец — Цукерачны фестываль, фестываль «Вольнае паветра» на аграсядзібе «Шаблі», у Капыльскім раёне — абрад «Калядныя цары», у Лагойскім — міжнародны парад нявестаў і злёт паветраплавальнікаў «Паветраны махіта», у Маладзечне — нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, у Старых Дарогах — нацыянальны фестываль бегу «Языльская дзясятка» і гэтак далей.

Азнаёміліся дэпутаты таксама з работай гасцінічнага комплексу «Гарадзейскі фальварак», што належыць цукроваму камбінату. Здзівілі тут цэны на пражыванне — ёсць нумары, якія каштуюць усяго 30-40 тысяч рублёў за суткі.

— Таму гатэль ніколі не пустуе, — не без гонару адзначыў намеснік дырэктара прадпрыемства Вячаслаў Карпач. — А месцы заказаны на некалькі тыдняў наперад.

— У радыусе 50 кіламетраў ад Мінска ў аграсядзібах нельга знайсці свабодных месцаў. Яны заняты не толькі жыхарамі сталіцы і вобласці. Шмат тут адпачывае замежных гасцей, — канстатаваў першы намеснік начальніка ўпраўлення па фізічнай культуры, спорту і турызму Мінаблвыканкама Васіль Гарбачоў. — Апошнім часам шмат хто прыязджае не толькі адпачываць, але і займацца спортам. У вобласці набірае абароты аздараўленчы турызм, запатрабавана і санаторна-курортнае лячэнне. Колькасць турыстаў у цэлым з кожным годам узрастае. Толькі за паўгода іх колькасць павялічылася на 18%.

У сталічным рэгіёне для развіцця турызму зроблена нямала. Прынамсі, створана адпаведная інфраструктура. Гэта 1753 аб'екты грамадскага харчавання, у тым ліку 145 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, 67 гасцініц, 33 санаторна-курортныя і 29 аздараўленчых арганізацый, 23 паляўнічыя комплексы і 15 цэнтраў рамёстваў.

Толькі летась аказана турысцка-экскурсійных паслуг амаль на 26 млн рублёў, а іх экспарт склаў каля 22 мільёнаў долараў. Гэта 12% удзельнай вагі ў аб'ёме такога віду дзейнасці ў Беларусі.

На думку дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзіма Кармазіна, як на Міншчыне, так і ў рэспубліцы аграэкатурызм развіваецца найбольш дынамічна. Напрыканцы мінулага года ў краіне было зарэгістравана 1536 аграсядзіб. Сёлета іх прыбавілася. Паводле папярэдніх звестак, за шэсць месяцаў, дзейнічае больш за 1800. «Гэтаму садзейнічаюць прадуманыя нарматыўна-прававая і падатковая базы», — лічыць спецыяліст.

Сёння стаіць задача, каб у турыста аграсядзіба асацыявалася не толькі з хатай у вёсцы ці месцам для начлегу. Трэба, каб чалавеку прапанавалі і добрую культурную праграму, і экскурсіі. А для гэтага варта падключаць да справы і сельскія культурныя ўстановы.

Нясвіжскі раён.

У Мінскай вобласці працуе грамадская рада па развіцці аграэкатурызму. Рада наладжвае партнёрскія адносіны паміж органамі ўлады, гаспадарамі сельскіх сядзіб, няўрадавымі арганізацыямі, прадстаўнікамі бізнэсу, турысцкімі прадпрыемствамі і наогул усімі зацікаўленымі юрыдычнымі і прыватнымі асобамі. Мясцовыя Саветы дэпутатаў своечасова прымаюць неабходныя рашэнні, якія датычацца гэтай сферы, вядуць інфармацыйную работу сярод насельніцтва. Сумесна з абласной грамадскай радай на Міншчыне распрацаваны графікі правядзення сустрэч і іншых мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць развіццю народных рамёстваў, звычаяў і абрадаў, культурнай дзейнасці ў сельскай мясцовасці. З неабходнай нарматыўна-прававой базай па аграэкатурызме ахвотныя могуць пазнаёміцца на стэндах, што аформлены ў пасялковых, сельскіх і гарадскіх Саветах дэпутатаў. Акрамя таго, у кожным з іх ёсць спісы свабодных (незанятых) зямельных участкаў, у тым ліку і канкрэтныя прапановы па выкарыстанні размешчанай на іх нерухомасці.

МЯСЦОВЫ ЧАС

СЛУЖЫЦЬ ПАЎСЮДНА

Ля храма ў гонар Богаяўлення, які знаходзіцца ў вёсцы Сіманічы Лельчыцкага раёна, зараз ідзе будаўніцтва званіцы. Айцец Іаан Палын за невялікую плату прыцягвае да работ у тым ліку грамадзян, якіх звычайна адносяць да групы рызыкі.

Протаіерэй Іаан Палын.

— Будуць занятыя, дык менш часу застанецца на тое, каб шукаць прыгоды, — разважае настаяцель царквы.

Гаворыць, у царкву такія людзі спачатку адважваюцца зайсці толькі пасля таго, як «прынялі на грудзі». Споведзь у такім стане немагчымая, а вось пагутарыць — калі ласка. Здараецца, што пасля такіх размоў грамадзяне мяняюць маршрут і ідуць дадому, мінаючы краму. Аднак працэс вяртання да чалавечага аблічча адбываецца не ў адзін момант, таму святар не называе прозвішчы тых, хто ўжо стаў на шлях выпраўлення. Гаворыць, што пакуль рана — чалавек можа не справіцца са спакусай. Тым не менш, добрыя прыклады ёсць, і нават сярод жанчын, якія лічацца асабліва цяжкім «матэрыялам» для выхавання. Дарэчы, айцец Іаан гаворыць, што яго намаганні цалкам супадаюць з намаганнямі мясцовай улады, якая ўсімі сіламі імкнецца выконваць дэкрэт № 18:

— Пасля таго, як гора-бацькам прыгразяць, што ў іх адбяруць дзяцей, здараецца, што тыя і піць перастаюць, і дома ўсё прыбяруць... Толькі ўсім разам і можна ўтрымаць некаторых ад самага апошняга кроку ў бездань. Усе прадстаўнікі сацыяльных устаноў у нашых Сіманічах вельмі дружныя. Калі што, мы імкнёмся адзін аднаму дапамагаць. Вось зусім нядаўна супрацоўніцы дзіцячага садка ля храма зрабілі прыгожую клумбу.

Старшыня Сіманіцкага сельскага Савета Таццяна Касцюкевіч у сваю чаргу расказвае, што настаяцель мясцовай царквы не толькі абавязкова ходзіць на штотыднёвую планёрку ў сельвыканкам, але і актыўна ўдзельнічае ў жыцці аграгарадка:

— У нас на дзень Перамогі ля помніка з прозвішчамі 125 жыхароў, што не вярнуліся з фронту, традыцыйна служыцца літыя па загінулых. Айцец Іаан заўсёды праводзіць работу па добраўпарадкаванні могілак. І сам асабіста выходзіць з газонакасілкай выкошваць пустазелле, і людзей да гэтай працы прыцягвае. У Доме культуры мы перыядычна збіраем людзей, якія шчыльна «сябруюць» з гарэлкай. Для іх паказваем фільмы, якія святар падбірае спецыяльна для гэтай катэгорыі.

Протаіерэй Іаан Палын не лічыць, што робіць нешта надзвычайнае:

— Царква ж не проста так у цэнтры вёскі знаходзіцца — яна павінна ўплываць на жыццё кожнага чалавека. Святар — не толькі служка храма, ён служка Бога. Значыць, трэба служыць паўсюдна, дзе неабходна дапамога. І ў бальніцу прыходжу, і на вечарыны ў доме культуры, прымаю ўдзел у жыцці школы — вяду факультатыў «Асновы праваслаўнай культуры».

Сапраўды, настаўнікі Сіманіцкай і Сярэдняпечскай школ задаволены, што айцец Іаан прыходзіць да вучняў. Акрамя таго, у мясцовай газеце ён друкуе нарысы па гісторыі роднага краю. Для таго, каб «раскапаць» цікавы матэрыял, ездзіць працаваць нават у сталічныя архівы. Сам ён нарадзіўся недалёка ад Сіманіч, у вёсцы Осаў. Яго продак — Вакула Лісіцкі служыў у мясцовым храме ў XVIII стагоддзі і будаваў царкву ў гонар Параскевы Пятніцы.

— У Сіманічах некалькі разоў будаваліся цэрквы. Адну з іх у 1806 годзе знішчыў пажар, апошнюю пры адступленні ў 1943 годзе спалілі фашысты, — расказвае айцец Іаан.

Дарэчы, той апошні, пяцікупальны драўляны храм, быў зачынены ў 1937 годзе. Але ж з гэтым не маглі змірыцца мясцовыя верніцы, якія 1 мая 1937 года (на гэты дзень прыпала ў той год Пасха Хрыстова) зламалі замок на царкве і пачалі ў ёй маліцца. Здарэнне стала падставай, каб абвінаваціць мазырскага святара Алексія Магільніцкага ў «стварэнні контррэвалюцыйнай групоўкі і правядзенні контррэвалюцыйнай работы». Такім чынам доля яго была прадвызначаная: расстрэл. Праз паўстагоддзя справядлівасць у дачыненні да айца Алексія была адноўлена. Ён быў не толькі рэабілітаваны, але і праслаўлены ў ліку святых новамучанікаў...

> **Настаяцель мясцовай царквы не толькі абавязкова ходзіць на штотыднёвую планёрку ў сельвыканкам, але і актыўна ўдзельнічае ў жыцці аграгарадка.**

Новы цагляны храм у Сіманічах, дзе настаяцелем служыць протаіерэй Іаан Палын, пабудаваны нядаўна. Службы на гэтым месцы пачаліся задоўга да завяршэння будаўніцтва, яшчэ ў 1990-м, але асвечана царква была ў 2008 годзе. Тым не менш, і тут ёсць свае рэліквіі: знайшоўся невялікі каваны крыж — з купала той самай царквы, што была ў вёсцы да вайны. Цяпер крыж знаходзіцца ў храме Богаяўлення. Ён маўкліва нагадвае сучасным жыхарам аб няпростым жыцці многіх пакаленняў вернікаў вёскі Сіманічы, якія змаглі з годнасцю пранесці свой жыццёвы крыж — нягледзячы на ўсе выпрабаванні лёсу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Царква ў гонар Богаяўлення ў аграгарадку Сіманічы Лельчыцкага раёна.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 27.631. Нумар падпісаны ў 19.30 10 ліпеня 2012 года.

ЭКЗАМЕН ПА СТРАЛЬБЕ...

прапаноўваецца ўвесці ў Беларусі для атрымання дазволу на паляванне

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Для атрымання дзяржпасведчання на права паляванне ў Беларусі прапаноўваецца ўвесці абавязковую здачу практычнага экзамену. Пра гэта паведаміў начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Мінлясгаса Сяргей Шастакоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Пры распрацоўцы праекта змяненняў і дапаўненняў да правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання ў Беларусі было прапанавана ўвесці ў працэс падрыхтоўкі паляўнічых практычныя заняткі, а таксама абавязковую здачу экзамену па стральбе пры атрыманні імі дзяржаўнага пасведчання на права паляванне. Гэта будзе садзейнічаць павышэнню культуры паляўнічых, а таксама ўзроўню валодання зброяй і здольнасці адрозніваць віды жывёл і птушак.

Яшчэ адным важным момантам, на думку спецыялістаў, можа стаць дазвол палявання з лукам і арбалетам. Цяпер такое паляванне дазволена толькі ў асобных гаспадарках. Гэтае змяненне можа прыцягнуць у Беларусь замежных паляўнічых, што, у сваю чаргу, станоўча адаб'ецца на эканамічным складніку вядзення паляўнічай гаспадаркі. Акрамя таго, плануецца выключыць з правілаў некаторыя пытанні тэхнічнага характару, якія рэгулююцца тэхнічнымі нарматыўнымі актамі. Гэта датычыцца правядзення ўліку колькасці жывёл, таргоў і інш. Зменены тэрміны палявання на некаторыя віды жывёл і птушак.

ДАГУЛЯЛІСЯ

У Віцебску спынена дзейнасць падпольнага казіно

— Мужчыны 1984 і 1982 года нараджэння, папярэдне аб'яднаўшыся ў арганізаваную групу, ажыццяўлялі незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць — адкрылі казіно так званых кэш-гульняў у покер за наяўныя грошы. Падазраваныя займаліся прадпрымальніцкай дзейнасцю, не маючы дзяржаўнай рэгістрацыі альбо спецыяльнага дазволу, — расказвае **Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці**. — З мэтай арганізацыі ігральнай дзейнасці яны арандавалі памяшканне на тэрыторыі Першамайскага раёна горада Віцебска. Закупілі ўсё неабходнае абсталяванне: сталы з суконным пакрыццём, фішкі, барную стойку, іншыя прадметы, неабходныя для стварэння інтэр'еру «казіно». Рэкламавалі ігральную ўстанову ў выніку стварэння «афіцыйнай групы» ў папулярнай сацыяльнай сетцы, а таксама на інтэрнэт-сайце, дзе размяшчалі як расклад турніраў, так і расклад гульняў. Злачынства раскрылі супрацоўнікі ўпраўлення па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама ва ўзаемадзеянні са следчым упраўленнем УСК па Віцебскай вобласці.

Як высветлілі праваахоўныя органы, члены арганізаванай групы дзейнічалі ў адпаведнасці з папярэднім планаваннем і размеркаваннем роляў. Адзін з падазраваных, выконваючы функцыі арганізатара групы, даваў указанні іншым членам і кантраляваў іх выкананне. А менавіта: арганізоўваў правядзенне турніраў і картачных кэш-гульняў у покер за наяўныя грашовыя сродкі, размяркоўваў даход паміж членамі арганізаванай групы і выкарыстоўваў яго для падтрымання, развіцця незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці і яе фінансавання. Другі падазараваны выконваў функцыі выканаўцы: па ўказанні кіраўніка групы ажыццяўляў кантроль за правядзеннем кэш-гульняў у покер, вёў перамовы з кліентамі аб правядзенні кэш-гульняў, займаўся рашэннем гаспадарчых пытанняў.

За ўвесь перыяд незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці арганізаваная група атрымала каля 100 мільёнаў беларускіх рублёў даходу — шляхам спагнання пэўных працэнтаў з выйгрышу кліентаў «казіно».

Упраўленнем Следчага камітэта па Віцебскай вобласці распачата крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КЛЮЧЫ АД «ЛАДЫ» — ВОІНАМ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАМ

Чатыром воінам-інтэрнацыяналістам, якія ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на тэрыторыі іншых краін і сталі інвалідамі, губернатар Мінскай вобласці Барыс Батура ўручыў ключы ад аўтамабіляў «Лада». Машыны набыты за сродкі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. А ўрачыстая цырымонія з нагоды гэтай падзеі адбылася ў Мар'інай Горцы.

Толькі ў адным Мінскім раёне ў мінулым годзе больш за тысячу воінаў, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак, і каля 120 сем'яў загінулых у Афганістане атрымалі матэрыяльную дапамогу з мясцовага бюджэту і ад разнастайных арганізацый. Беларусам, што вярнуліся з гарачых кропкаў, штогод прадастаўляецца медыцынская рэабілітацыя ў шпіталях і іншых установах аховы здароўя, а таксама аказваецца дапамога ў арганізацыі бізнэсу.

Ад імя воінаў-афганцаў, якія атрымалі аўтамабілі, Аляксандр Шманок падзякаваў уладзе за клопат, за ўважлівае стаўленне да ветэранаў.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Мінскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», палкоўнік у запасе Павел Крэс і старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», камандуючы ўнутранымі войскамі — намеснік міністра ўнутраных спраў Валерый Гайдукевіч. У прыватнасці, ён адзначыў, што дзяржава надае дастатковую ўвагі праблемам воінаў-інтэрнацыяналістаў. 10 мая адбылася сустрэча актыву аб'яднання, якое ён узначальвае, з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Падчас яе вызначана кола праблем, якія трэба вырашаць. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы даў даручэнні зацікаўленым службам.

У Пухавіцкім раённым цэнтры культуры прайшоў «Урок мужнасці», дзе прынялі ўдзел 200 навучэнцаў ваенна-патрыятычных класаў Міншчыны. А ў гарадскім скверы былі арганізаваны паказальныя выступленні воінаў 5-й асобнай брыгады спецыяльнага назначэння.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ГАРАЧА І НЕБЯСПЕЧНА

На вадаёмах Магілёўскай вобласці за мінулы тыдзень загінулі 8 чалавек. Такую жахлівую статыстыку звязваюць з гарачым надвор'ем.

Жыцці двух маладых людзей абарваліся 8 ліпеня, у нядзелю. З моста праз Днепр у Магілёве скокнуў 19-гадовы хлопец, і яго цела знесла хуткай плынню. У зоне адпачынку ў Пячэрску, што ў абласным цэнтры, 23-гадовы мужчына пераадаленіў свае сілы і не здолеў пераплыць возера. Прычына здарэння — алкаголь. У таварыстве выратавання людзей на вадзе раяць быць асцярожнымі і сачыць за нецвярозымі сябрамі.

Спякота таксама адбіваецца на самаадчуванні людзей. За мінулыя тры дні толькі ў Магілёўскую гарадскую бальніцу хуткай дапамогі даставілі два дзясяткі чалавек. Пацярпелыя ад сонечных і цеплавых удараў паступалі ў непрытомным стане, і большасць з іх давялося шпіталізаваць. Старыя, здаралася, млелі на вуліцы. Маладыя людзі таксама не заўсёды паводзяць сябе асцярожна. Медыкі раяць усім выходзіць з дому ў галаўным уборы, у светлым натуральным адзенні, піць больш вады.

Ілона ІВАНОВА.

ВІРТУАЛЬНЫ «МЕДЫК»

Прадпрымальны жыхар Віцебска за тры гады зарабіў больш за 115 мільёнаў рублёў на продажы праз інтэрнэт тавараў медыцынскага прызначэння.

— Гэтым бізнэсам грамадзянін, не маючы адпаведнага дазволу, займаўся, пачынаючы з 2009 года. Ён ажыццяўляў рознічную рэалізацыю медыцынскіх тавараў насельніцтву з атрыманнем аплаты за тавар у выглядзе электронных грашовых пераводаў, — паведамілі ва ўпраўленні дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці. — У дачыненні да грамадзяніна распачата крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВОЗ «ВЫВЕЗ» НА БРАКАНЬЕРАЎ

Работнікі Бабруйскай міжрайінспекцыі разам з егерскай службай Кіраўскай раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў знайшлі ў паляўнічых угоддзях вышэйназванага карыстальніка месца незаконнай здабычы дзікай жывёліны. Быў тут і след воза...

Гэты самы воз са слядамі крыві, галавой і мясам дзіка «знайшоўся» ў адной з вёсак Кіраўскага раёна. Было ўстаноўлена, што дзіка незаконна ўпалявалі трое непрацуючых грамадзян. У іх канфіскавалі тры зарэгістраваныя паляўнічыя стрэльбы з боепрыпасамі, а таксама мяса і шкуру дзіка. Шкода склала 6 мільёнаў рублёў. Парушальнікаў чакае крымінальная адказнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

23 июля 2012 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

Повестка дня: 1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 18.07.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров. УНП 200246280

ТЫ ТОЛЬКІ ЦЫРЫКНІ

Аляксандр БРЫТ

Урывак з апавядання

Аляксандр Брыт — з пісьменнікаў, якія друкуюцца нячаста. Калі даследаваць, як кажуць, гісторыю пытання, то можна і пералічыць, відаць, усе яго публікацыі за апошнія два дзесяцігоддзі. У сярэдзіне 1990-х гг. у «Літаратуры і мастацтве» — апавяданні «Трывіяльнае пытанне (Урокі Дастаеўскага)», «Вошы», «Мроі». У 1991-м у «Нёмане» — нізка апавяданняў, якія, дарэчы, былі адзначаны па выніках года прэміяй часопіса. У лістападзе 2011-га «Маладосць» друкуе апавяданне «Апошні джэб», прысвечанае Алесі Граф — беларускай дзяўчынцы, якая некалькі гадоў адстойвала гонар беларускага сцяга на баксёрскім рынгу. У сакавіку 2012 года «ЛіМ» надрукаваў перакладзеныя Аляксандрам Брытам з польскай мовы афарызмы Станіслава Ежы Леца. Падборка была названа «Гадзіннік ідзе. Для ўсіх». Вядома, кожны з нас пражывае сваю асабістую гісторыю, бо лёс чалавека — гэта заўсёды воля і абставіны. Так што няхай не пакрыўдзіцца пісьменнік, але такой мне асабіста падаецца і яго проза — для ўсіх. Але ж добрая проза — для ўсіх... Ці такога, скажаце, не бывае? На крайні выпадак мяркуйце самі. І па ўрыўку з апавядання «Ты толькі цырыкні», і па ўсім апавяданні, якое друкуецца ў шостым нумары часопіса «Нёман».

Кастусь ЛЕШНІЦА.

ГЭТА быў закон. Як выпіты кубак моцнай кавы раніцай, як выкураная цыгарэта пасля сухпайка ў Афганістане.

Кожную раніцу ён адціскаўся 51 раз, рабіў зарадку і расцяжку.

Глебаву было 53, свайго закону ён прытрымліваўся 35 гадоў, і здрадзіў яму толькі адзін раз: 19 гадоў таму, калі яго разам з трохгадовай дачкой кінула жонка. 7 дзён яму спатрэбілася на тое, каб зразумець, што жонка больш не вернецца, і перабудаваць сваё жыццё. Пасля ён зноў няўхільна працягваў прытрымлівацца свайго закону.

Жонка пайшла да іншага, і паўтараць яшчэ адзін раз эксперымент пад назвай «шлюб» ён не жадаў. Таму ўвесь свой час, увагу і клопат Глебаў прысвяціў дачцэ.

Замяніць маму было амаль немагчыма. Сябры жартавалі, называлі яго «маці Тэрэза», але ж ён не згаджаўся і падкрэсліваў: «Не, я не маці. Я — бацька».

Тры гады Глебаў тузаўся з маленькім дзіцем па сябрах, чужых кватэрах і інтэрнатах. Калі пайшоў чацвёрты год, пачаў будаваць платнае, кааператыўнае жыллё. Глебаў зарабляў грошы на дзвюх працах, адводзіў дачку ў дзіцячы садок, прыбіраў у кватэры, мыў бялізну, купляў прадукты, гатаваў ежу і два разы на тыдзень не больш як на дзве гадзіны заходзіў у госці да адной жанчыны, каб застацца мужчынам.

Але ж, нягледзячы на ўсе свае абавязкі, на дачку ён знаходзіў час заўсёды, кожны дзень, і ўсе яе дзіцячыя праблемы і клопаты станавіліся яго дарослымі праблемамі і клопатамі. Калі разам бавілі час, яны размаўлялі. Маленькая дзяўчынка абдымала яго за шыю і пыталася: «А ты сапраўды купіш мне плюшавае медзведзяня?» — «Сапраўды. Ты толькі цырыкні». — «А што гэта — цырыкні?» — «Цырыкні — гэта скажы». — «А хто так гаворыць: цырыкні?» — «Мы разам з табою». — «А мы з табою хіба вераб'і?» Глебаў смяяўся: «Так, асабліва ты».

Волі споўнілася 10, калі Глебаў прадаў кааператыў, узяў крэдыт і набыў добрую трохпакаёвую кватэру ў цэнтры Мінска, на плошчы Перамогі. У кватэры ён зрабіў рэканструкцыю: паміж двума пакоямі знёс цагляную перагародку і аб'яднаў іх у адзін прасторны пакой. У гэтым пакоі было шмат сонца, і Глебаў вырашыў аддаць яго дачцэ, а сабе пакінуў пакой меншы.

Пасля рамонту і пераезду ў новую кватэру ён узяў для дачкі рэпетытара па англійскай мове і перавёў яе ў 24-ы лінгвістычны ліцэй. Яшчэ да моманту заканчэння ліцэя яго дзяўчынка «спявала» па-англійску: бегла гаварыла, з паўфразы разумела і адказвала. Тым не менш, у большай ступені для таго, каб псіхалагічна падтрымаць яе перад паступленнем у лінгвістычны ўніверсітэт, Глебаў зноў на месяц узяў ёй рэпетытара і плаціў яму 18 долараў за акадэмічную гадзіну пяць разоў на тыдзень. Яго страхі былі марныя, таму што Вольга бліскуча здала іспыты і паступіла бясплатна. І вось тут ён зменшыў сваю дбайнасць і трохі прытушыў дзейны клопат. Дачка яго вырасла, ператварылася ў прыгожую мэтанакіраваную дзяўчыну, і Глебаў не хацеў, каб яго пытанні і залішні спрыт сутыкаліся з трафарэтнымі адказамі: «Ну што ты кажаш глупства, тата». Ён вельмі любіў слухаць, як смяецца дачка, і не ўяўляў свайго жыцця без яе смеху, таму што гэты сонечны смех быў яго паветрам, яго крывёю, яго сэнсам.

Больш за ўсё ён баяўся хлопчыка, які аднойчы ўварвецца ў свет яго дачкі, забярэ яе сэрца і зробіць з яе жанчыну. Безумоўна ж, Глебаў ведаў, што гэты хлопчык калі-небудзь з'явіцца, але ён не быў упэўнены, што гэты хлопчык насамрэч зразумее і ацэніць тое, што значыць для яго дачка. Глебаў не быў упэўнены, ці зможа гэты хлопчык стаць яе абаронай, апорай і сябрам у той хаця бы прыблізнай меры, у якой 20 апошніх гадоў быў для яе ён сам.

На другім курсе ў Вольгі з'явіўся першы кандыдат на яе ўвагу і час, але ж яна забракавала яго літаральна праз два тыдні. «Я не буду выціраць яму соплі, — зусім не мякка сказала яна сваёй сяброўцы па тэлефоне. — Няхай сам адказвае за тое, што робіць».

З другім кандыдатам было складаней: ён прэтэндаваў на сур'ёзныя адносіны і прапаноўваў Вользе стаць яе мужам за год да заканчэння ўніверсітэта. Тут ужо ўсталёвалася перспектыва, вызначалася далейшае жыццё, і не ў звычках Глебава было займаць пазіцыю пасіўнага назіральніка. Ён знайшоў магчымасць падзяліцца са студэнтам сваімі поглядамі на жыццё. Малады чалавек быў настолькі ласкавы, што сам прыйшоў да іх у госці, сеў у крэсла ў самым вялікім пакоі і дэманстраваў свой катастрафічна шырокі кругагляд, у той час як Вольга на кухні мыла посуд. Глебаў не перапыняў маладога чалавека максімум секунд пяцьдзясят, а потым, схапіўшы яго ўчэпістым позіркам, ціха загаварыў:

— Я хачу паведаміць, што цябе чакае, родны, калі мая дачка пагодзіцца ўзяць з табой шлюб. Усё жыццё я для яе быў і тата, і мама. Для мяне няма сонца, акрамя яе, і дзень без яе — не дзень. Таму я хацеў бы, каб вяселле адбылося не раней, чым праз два гады. За гэтыя два гады ты павінен знайсці добрую працу, унесці першапачатковыя ўзносы на жыллё і падрыхтаваць усё неабходнае для нявесты. Да жаніцьбы ў цябе павінна быць як мінімум дзве пары туфляў, сем новых кашуль, пяць гальштукаў і тры касцюмы. Пра аўтамабіль я, зразумела, маўчу. Ты павінен быць заўсёды першым. І яшчэ. Калі ты калі-небудзь зробіш маёй дачцэ балюча, калі ты калі-небудзь яе хоць ледзь-ледзь пакрыўдзіш, у цябе, родны, будуць непрыемнасці. Я табе абяцаю. Падумай пра гэта. І калі вырашыш, што гэта табе не патрэбна, не тэлефануй ёй больш ніколі.

Другі кандыдат быў не па гадах разумным і таму адразу прыслухаўся да парады Глебава. Вольга зусім не сумавала, і Глебаў з палёгкай зразумеў, што па-сапраўднаму яна не кахала.

Бяда здарылася з трэцім прэтэндэнтам на сэрца яго дачкі. Па-першае, відавочна, гэта было каханне, і не без узаемнасці. Па-другое, ён быў старэйшы за яго дачку на 18 гадоў і трапляў, хутчэй, у катэгорыю мужчын, чым хлопчыкаў. І, па-трэцяе, ён быў жанаты.

Для Глебава гэта была вельмі вялікая праблема, і, шчыра кажучы, ён не ведаў, ці зможа дапамагчы дачцэ ў яе вырашэнні.

Глебаў меў нюх вопытнага мужчыны і, нібыта сталы воўк, чуў, што жаночае сэрца не паддаецца ніякаму рацыянальнаму тлумачэнню, не вымяраецца ніякай логікай, і калі ў яго ўліваецца каханне, то яно можа знесці любыя плаціны, увайсці ў іншыя рэчышчы і ўтварыць іншыя берагі... Глебаў доўга пакутаваў, таму што не ведаў, як паступіць. Ён не меў права нічога дыктаваць сваёй дзяўчынцы: яна вырасла, і, калі б ён рушыў самым простым шляхам забарон і дыктату, гэта толькі зруйнавала б іх адносіны. І яшчэ ён бачыў, што каханне змяніла яго дачку, зрабіла яе яшчэ больш чароўнай, лёгкай, запоўніла яе вочы і твар улагоджаным ціхім святлом, і Глебаў баяўся загасіць гэты нябачны агаг, спалохаць матылька, які прыляцеў да вясновай кветкі...

Адціскаючыся ад падлогі па раніцах нязменных 51 раз, Глебаў абдумваў кожную дэталь сваіх паводзін у новых абставінах. Ён не прыдумаў нічога іншага, акрамя як быць побач са сваёй дачкой. Быць побач, для таго, каб у любы момант дапамагчы ёй, засцерагчы яе, падстрахаваць, даць найбольш зручную параду. Яму здавалася, гэта была самая дакладная пазіцыя. Ва ўсякім выпадку нічога іншага выдумаць ён не змог.

Выдумала яго дачка, і таму «быць побач» не атрымалася.

— Я хачу з'ехаць, тата, — сказала яна, уздыхнуўшы.

Гэта была нядзеля, вераснёвая раніца, за акном віднеўся Купалаўскі сквер, ранюю жаўцізну лістоты залівала бледнае сонца. Яго дзяўчынка глядзела ў акно: на сквер, на Свіслач, а потым павольна павярнулася да бацькі, і ён убачыў, якая яна прыгожая. Замацаваныя шпількамі прамыя валасы, вялікія аленевыя вочы, тонкая рука, якая паволі паправіла пасму і пацягнулася да кубачка з кавай.

Глебаў ведаў іх размову да дробязяў. Памяць яго, як кінакамера, пастаянна брала поўны перыметр, набліжалася і выхоплівала ўсе дэталі таго дня, усе адценні іх дыялога. Ён памятаў, што, калі яна вымавіла гэтую фразу, ён у першае імгненне не надаў ёй аніякага значэння, таму што не зразумеў яе поўнага сэнсу.

— З'ехаць?

— Так, я хачу з'ехаць, — яна ўсміхнулася адкрытай усмешкай, доўгія вейкі ёй ўздрыгнулі, і ён з болем у сэрцы ўбачыў, як моцна яна нагадвае сваю маці. — Я хачу з'ехаць на Кіпр, тат. Папрацаваць у гасцінічным бізнэсе — там патрабуюцца спецыялісты з веданнем англійскай. Я ўжо запоўніла анкету і адаслала. Мне ўчора адтуль ператэлефанавалі, мая кандыдатура прайшла.

Толькі пасля гэтага да яго, нарэшце, дайшоў поўны сэнс яе фразы.

— Ты ўпэўнена?

— Так.

— І ты ўсё роўна зробіш па-свойму, калі я стану пярэчыць?

— Ты ж ведаеш...

— А твая праца?

— Я вазьму засведчаны ліст з працы, каб не губляць стажу.

Глебаў усміхнуўся.

— Разумнічаеш?

— Бяру прыклад з цябе.

— Не здзіўлюся, калі пазнаю, што ты ўжо купіла білет на самалёт.

— Не, але я планую зрабіць гэта пасля заўтра, а паляцець у суботу.

Глебаў памятаў, як ён устаў тады з-за кухоннага стала, падышоў да акна, паглядзеў на асляпляльна яркую верасневую восень. Шкада было развітвацца з такой прыгажосцю...

...Білет ён набыў ёй сам. Сам перавёў ёй пяцьсот кіпрскіх фунтаў[1] у дарожныя чэкі і чатырыста даў чыстымі, сам дапамагаў адкрываць ёй роўмінг, сам падвозіў да аэрапорта. За рулём смяшыў яе, размаўляў, але ў той жа час думаў: што ведае, можа, і нядрэнна, што яна прыняла такое рашэнне. Каханне — так, гэта кайф, казачны кайф, страшны кайф, але навошта руйнаваць чужую сям'ю? Навошта ствараць праблемы? Не, яна ўсё разумее, тонкая дзяўчынка, разумніца. Менавіта таму змяняе становішча, хоча быць самастойнай, падзарабіць, а там відаць будзе...

На развітанне ён пацалаваў яе тройчы.

— Будзь на сувязі. Я ўсё зраблю. Толькі цырыкні.

Яна ўсміхнулася:

— Люблю цябе, — і, цмокнуўшы яго ў шчаку, пайшла ў глыб аэрапорта, да рэгістрацыйных стоек.

Глебаў праводзіў яе сумным поглядам, і гэты погляд, здавалася яму пазней, паўтараўся, як адзін і той жа чорна-белы слайд, які яго памяць перыядычна ўстаўляла ў мозг.

Яна патэлефанавала праз дзень: не з мабільнага — па звычайнай сувязі, смяялася, спяшалася казаць.

— У мяне ўсё нармальна, тат. Усё выдатна. Я ўладкавалася, не хвалюйся. Толькі сотавы трошкі глючыць.

— Ты ў парадку?

— Так, усё нармальна.

— Заўсёды памятай: ты толькі цырыкні.

— Я заўсёды памятаю, дзякую. Паслухай...

— Так.

— На маім стале — ліст. Адпраў яго, калі ласка, на адрас — я забылася. Добра?

— Як скажаш.

— Абавязкова!

— Вядома. Я ўсё зраблю. А як з працай?

— Што?

— Як з працай?

— Ды ўсё нармальна. Сёння я павінна падпісаць кантракт. Тут такая мітусня. Я ператэлефаную табе праз тыдзень. Уладкую справы і абавязкова ператэлефаную. Добра?

— Добра.

Тым жа днём ён кінуў яе ліст у паштовую скрыню. Роўна тыдзень ліст ляжаў на краі яе пісьмовага стала, Глебаў здагадваўся, каму адрасаваны гэты ліст, ён думаў, што ліст пойдзе па прызначэнні яшчэ да яе ад'езду, але гэтага не здарылася. Адрас, імя, імя па бацьку, прозвішча таго, каму прызначаўся ліст, ён ведаў ужо на памяць...

Праз тыдзень яна не ператэлефанавала.

(Заканчэнне будзе.)

[1] *Кіпрскі фунт — грашовая адзінка Рэспублікі Кіпр да 2008 года. 1 кіпрскі фунт быў роўны прыкладна 2 долярам ЗША. 1 студзеня 2008 года Рэспубліка Кіпр уступіла ў еўразону, 1 лютага кіпрскі фунт канчаткова выведзены з абарачэння.*

■ Прыёмная кампанія-2012

АДУКАЦЫЯ НА ЭКСПАРТ

Расіяне змогуць паступаць у беларускія ВНУ без экзаменаў, але толькі на платную форму навучання

Нягледзячы на тое, што зацвярджэнне новай рэдакцыі Правіл прыёму ў ВНУ і ССНУ было адкладзена на пачатак наступнага навучальнага года, адзін пункт з іх усё ж такі распаўсюдзіцца і на абітурыентаў узору 2012 года. Размова, у прыватнасці, ідзе пра грамадзян Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі і Рэспублікі Таджыкістан, якія пажадаюць атрымліваць адукацыю ў беларускіх ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах на платнай аснове.

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве адукацыі, грамадзяне гэтых краін змогуць ужо сёлета паступаць на правілах, прадугледжаных для замежных грамадзян, гэта значыць, па выніках гутаркі, але з улікам аплаты за сваё навучанне на месцы. **Такім чынам, канкурэнцыю беларускім абітурыентам яны не створаць.**

Трэба патлумачыць, што грамадзянам Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана дадзены роўныя правы з грамадзянамі Беларусі пры паступленні ў ВНУ і ССНУ для атрымання адукацыі за кошт бюджэтных сродкаў і на платнай аснове, але цяпер у іх з'явілася дадатковая магчымасць — паступаць не толькі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання на «бюджэт», але і па выніках гутаркі, як іншаземцам, на платнае навучанне. Нагадаем, што раней гэтая катэгорыя абітурыентаў залічвалася і на платную форму навучання толькі на конкурснай аснове па выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання.

У галоўным адукацыйным ведамстве нашай краіны спадзяюцца, што гэты крок паспрыяе нарошчванню экспарту адукацыйных паслуг. Трэба мець на ўвазе, што ў большасці расійскіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў прыём беларусаў для навучання на платнай аснове таксама ажыццяўляецца па выніках гутаркі, пры гэтым тэрміны падачы дакументаў фактычна не абмежаваны (навучанне распачынаецца па меры камплектавання груп). **ДЛЯ ДАВЕДКІ: у беларускіх ВНУ зараз навучаецца ўсяго 2 тысячы расійскіх грамадзян, а колькасць беларусаў, якія атрымліваюць у Расіі вышэйшую адукацыю, у 10 разоў большая.**

Надзея НІКАЛАЕВА

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 10 августа 2012 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе (дополнение)

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
37	Петришковский с/с, д. Шубники, участок № 3	623685709601000292	0,1222 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	3 800 000	70 000 000	14 000 000
38	Петришковский с/с, д. Шубники, участок № 4	623685709601000291	0,1226 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	3 800 000	70 000 000	14 000 000
39	Петришковский с/с, д. Шубники, участок № 5	623685709601000293	0,1373 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	3 800 000	70 000 000	14 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 10.08.2012 г. в 10:00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 06.08.2012 г. в 17:00. Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 37-39 перечисляется на расчетный счет № 3641900000277 Петришковского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка;

3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

**** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.***

НА «ПАРОЗЕ» КОСМАСУ

Экіпаж беларускага касманаўта Алега Навіцкага набыў статус асноўнага

Дні, што мінаюць-мільгаюць зараз адзін за адным, набліжаюць кожнага з нас да якойсьці значнай падзеі, вяхі ў жыцці. У кагосьці гэта — дзень народзінаў, у іншага — доўгачаканы адпачынак. А мой аднакласнік, ураджэнец Чэрвеня, касманаўт-выпрабавальнік Алег Навіцкі з кожным днём усё бліжэй падыходзіць да старту карабля «САЮЗ-ТМА-06», у якім ён, камандзір экіпажа, калега з Раскосмасу Яўген Тарэлкін і астранаўт НАСА Кевін Форд паляцяць да зор. Засталося прычакаць усяго адзін старт іншага экіпажа (МКС-32/33) — і яны выходзяць на фінішную прамую.

Колькі ўсяго зроблена-выпрабавана-перажыта за перыяд падрыхтоўкі — не злічыць! Але самае значнае — гэта дубліраванне асноўнага экіпажа МКС-31/32 у складзе Генадзя Падалкі, Сяргея Рэвіна і Джазэфа Акабы, старт якога адбыўся 15 мая. Значнае не толькі таму, што Алег Навіцкі з калегамі выконвалі ўсе тыя ж дзеянні, нібы і самі ляцелі... А яшчэ і таму, што яны з моманту старту Генадзя Падалкі з калегамі набылі статус асноўнага экіпажа. І ўжо ў іх ёсць свае дублёры.

Зрэшты, расслабляцца пасля ім не выпадала. Амаль адразу ж Алег Навіцкі і Яўген Тарэлкін накіраваліся ў двухтыднёвую камандзіроўку ў Амерыку, да Кевіна Форда. А затым надарылася-такі некалькі выхадных запар перад Днём Расіі, і Алег накіраваўся ў Чэрвень, каб сустрэцца з роднымі, знаёмымі, сябрамі і дапамагчы маме, Валянціне Эдуардаўне, па гаспадарцы. Прыемна, што ў сваім шчыльным графіку мой аднакласнік знайшоў час і на чарговае інтэрв'ю.

— Алег, я чытала, што ў вас было многа традыцыйных мерапрыемстваў. Раскажы, калі ласка, пра іх падрабязней. Што запомнілася, найбольш уразіла?

— Ведаеш, усё было дзіўна і прыемна. Асабліва — усведамляць, што ты сам дайшоў ужо і да гэтых момантаў. І зараз след у след ідзеш за тымі людзьмі, якія заклалі традыцыі, — за Юрыем Гагарыным, яго сябрамі, калегамі...

Разам з асноўным экіпажам мы ўдзельнічалі ў прэс-канферэнцыі. Безумоўна, асноўная ўвага журналістаў была скіравана на Генадзя Падалку, Сяргея Рэвіна і Джазэфа Акабу. Але і нам задалі некалькі пытанняў. Напрыклад, які будзе пазыўны і чаму менавіта ён? Я адказаў так: «Пазыўны нашага экіпажа — «Казбек», па назве аднаго з пяцітысячнікаў паўночнага Каўказа. Думаю, што горы заўсёды дарылі адчуванне ўпэўненасці, сілы і непрыступнасці. Вышыня гэтага пяцітысячніка — 5033 метры. Нумар нашай экспедыцыі — 33. Сімвалічна!»

Затым мы наведалі працоўны кабінет Юрыя Гагарына, які знаходзіцца ў музеі Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў. Там ёсць памятная кніга, дзе кожны член экіпажа перад палётам у космас пакідае свой запіс. Хаця мы былі яшчэ толькі дублёрамі, але ўслед за асноўным экіпажам таксама гэта зрабілі. Потым усе разам усклалі кветкі да помніка першаму касманаўту ў Зорным гарадку, а другога мая вылецелі на Байканур, дзе размясціліся ў вучэбна-трэніровачным цэнтры.

— На фотаздымках з сайта Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.Гагарына я назірала, што ад тых жа журналістаў вас аддзяляла шкло. Захоўвалі стэрыльнасць?

— Так. За шкло для стасункаў з журналістамі мы выходзілі некалькі разоў. Зразумела, і тут у першую чаргу яны цікавіліся асноўным экіпажам. А мы пераважна назіралі, як праходзяць такія мерапрыемствы, вучыліся, занатоўвалі... Асабіста я для сябе зрабіў шмат запісаў па дробязях, скажам так. Калі што робіцца, як...

— А ў касмічным караблі, які паляцеў, ты ж таксама быў?

— Безумоўна! Гэта частка нашай падрыхтоўкі. Экіпаж дублёраў павінен пасядзець, папрацаваць рукамі ў «баявым» караблі, як яго там называюць. Хаця для мяне, лётчыка, паняцце «баявы» крыху іншае... Нам там мяняюць лажаменты. Для кожнага ж вырабляюць свой. Гэта вельмі глыбокае крэсла, у якім ты фактычна прымаеш позу зародка. У такой позе трэба знаходзіцца пры вывядзенні 528 секунд. І яшчэ 2 віткі па 90 хвілін. А потым ты ўжо выходзіш і пачынаеш працаваць ва ўсім караблі. Адчыняецца люк у бытавы адсек — там крыху больш месца.

Дык вось падчас перадстартавай падрыхтоўкі наземная каманда замест лажаментаў асноўнага экіпажа ставіць нашы. Гэта займае да трох гадзін. Экіпаж дублёраў, як я ўжо казаў, павінен пасядзець і, так бы мовіць, «павадзіць» рукамі. Дзе што дастаеш, не дастаеш у гэтым караблі... Бо, у прынцыпе, усякае можа здарыцца... Таму трэба хаця б візуальна і мануальна быць гатовым да працы. Потым мы ад'язджаем, а наземная каманда зноў мяняе лажаменты — пад асноўны экіпаж.

— А як скафандр пашылі — не ціснe? *(Смяёмся.)* **У ім нармальна можна рухацца?**

— Не, пашыты добра. І гэта пры тым, што звычайна два разы ездзяць на «Звязду» — прадпрыемства, якое іх шые. А мы з Жэнькам Тарэлкіным ездзілі тры ці чатыры. Спецыялісты глядзяць, правяраюць, выцягваюць, абразаюць, падганяюць. Па вазе ён, па-мойму, ад 9 да 10 кілаграмаў. Ведаеш, скафандр пашыты пад гэтую позу ў лажаменце — зародка. Калі ты ў ім ідзеш, вельмі цяжка выпраміцца ў поўны рост. Таму касманаўты і ідуць вось так *(паказвае)* — з сагнутымі плячыма, з чамаданчыкамі ў руках. Можна, вядома, выпраміцца, але там ужо кальцо металічнае пачынае ціснуць на патыліцу... Непрыемна...

— Алег, наколькі насычанымі былі дні на Байкануры ў перадстартавы перыяд, калі параўнаць іх са звычайнымі працоўнымі ў Зорным?

— На Байкануры было намнога лягчэй. Там шмат вольнага часу. Можна было займацца фізпадрыхтоўкай... Па тэрыторыі можна пагуляць — яна ж аблароджана. Але ўсе нашы спецыялісты, нават тыя, хто быў з табою ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў у Зорным, стараюцца не падыходзіць, не мець стасункаў. Гэта як правіла. Калі займаешся фізпадрыхтоўкай, побач з табою абавязкова павінен знаходзіцца інструктар па фізпадрыхтоўцы. Але нас шэсць чалавек, а ён — адзін. І калі ўсе захочуць займацца ў розны час, дык яму цяжка, вядома. Таму стараліся збірацца разам.

— Мне спадабаўся здымак, дзе вы — на фоне ракеты-носьбіта, якая павінна была вывесці на арбіту касмічны карабель асноўнага экіпажа. Упершыню бачылі яе прыбыццё?

— Ды не. Да гэтага мы ж былі ўжо на Байкануры, дзе нам паказвалі ўвесь працэс падрыхтоўкі. У прынцыпе, без розніцы, якая ракета — грузавая ці пілатуемая. Мяняецца толькі верхняя частка — ставіцца грузавік ці пілатуемы варыянт. Як кажуць, усе ракеты, у прынцыпе, аднолькавыя. Але той, хто ляціць, зазначае: «Мая — самая прыгожая!» *(Смяёмся.)*

— Алег, раскажы, калі ласка, пра ноч перад стартам.

— Спалі мала, бо па мясцовым часе пад'ём быў у дзве гадзіны ночы. Рана ўсталі. Потым для асноўнага экіпажа ідуць усялякія медыцынскія працэдуры. А мы проста ходзім побач, глядзім. Затым, па традыцыі, касманаўты распісваюцца на дзвярах нумара. Прыязджае бацюшка, бласлаўляе. Далей уключаюць песню «Трава у дома»...

— Ой, ты што?! Праўда?

— Так. Выходзіць асноўны экіпаж. За ім — мы, дублёры. Па баках — урачы, як сек'юрыці *(усміхаецца)*. На ганку крыху папазіравалі фатографам — і куценька ў аўтобус. Ніякіх стасункаў ні з кім.

І вось экіпаж едзе на стартавы комплекс. У асобным кабінеце касманаўтам мяняюць ніжнюю бялізну, апранаюць скафандры, правяраюць герметычнасць. Кароткая гутарка з кіраўніцтвам, развітанне з сем'ямі — і экіпаж ідзе праз асобны выхад. Там такая лінія намалявана... А мы ўжо адыходзім убок і выконваем ролю гледачоў. Экіпаж падыходзіць да кіраўніка Раскосмасу і кіраўніка комплексу, дакладвае. Іх садзяць у аўтобус і вязуць да ракеты. А мы едзем на наступным аўтобусе і знаходзімся побач да моманту падняцця на стартавую пляцоўку.

— Алег, а якія ўражанні ад гэтага старту?

— Ну, неяк... Не тое каб мурашкі пабеглі... Але штосьці такое...

— А зайздрасць?

— *(Эмацыйна.)* Не, зайздрасці ніякай! Калі б ва ўсіх яна была, атрад касманаўтаў разваліўся б даўно! Ты цудоўна разумееш, што твая чарга — вось яна, на падыходзе. І трэба ісці дастойна, не спяшаючыся, не па галовах...

— Добра сказаў! А то ў гэтым жыцці такое назіраеш...

— *(Пераканаўча-цвёрда.)* Сказаў праўду. Толькі так!

— А як атрымалася суаднесці, што вось толькі што яны стаялі побач — і ўжо дзесьці ТАМ?

— Сапраўды, няпроста. Ты з імі доўга працаваў разам, ішоў паралельна. Інструктар асноўнага экіпажа казаў нам *(імітуе голас)*: «Ну што, «канкурыруючая фірма», гатовы?» Мы: «Гатовы!» *(смяёмся)*. Усё гэта жартам, вядома... І вось — раз! — і паляцелі... І ты думаеш: «Гэта быў твой асноўны экіпаж...» А затым усе падыходзяць і кажуць: «Ну, віншуем! Цяпер вы — асноўны экіпаж!» І за намі ўжо свая «канкурыруючая фірма» стаіць *(смяёмся)*.

— Але ж усяго некалькі гадоў таму, мабыць, не было столькі палётаў?

— Так. Было два старты ў год, а цяпер — чатыры. Вельмі добра, што працэс пайшоў хутчэй, чарга прасунулася. Дарэчы, наш старт крыху перанеслі. Цяпер мяркуемая дата — 15 кастрычніка.

— І што напарадзе?

— Яшчэ адна камандзіроўка ў Амерыку. Для нас і таго экіпажа, з якім пэўны час будзем разам на МКС. Здадзім экзамен па амерыканскім сегменце. А потым да сярэдзіны верасня будзе толькі карабель і наш сегмент МКС. Больш часу зойміць эксперыменты, фізкультура, медыцына, тэставыя замеры... Пойдуць тыя ж экзамены, якія мы здавалі як дублёры...

У чарговы раз шчыра і сардэчна зычу Алегу Навіцкаму поспехаў і ўдачы. Ён прыязна ўсміхаецца і адыходзіць, каб праз якія паўгадзіны накіравацца ў Зорны. А я застаюся сам-насам з думкамі, уражаннямі... І не губляю надзеі, што мы яшчэ ўбачымся да старту. Мне ж так многа трэба ў яго спытацца...

Гутарыла Святлана АДАМОВІЧ.
Фота з сайта Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. Гагарына.

■ Подых фестывалю

ВІЦЕБСК ДА «БАЗАРУ» ГАТОВЫ!

Заўтра распачнецца 21 Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», у якім возьмуць удзел каля 5 тысяч прадстаўнікоў з 28 краін свету.

«Ліра» вялікая і маленькая

Прызы песенных конкурсаў «Славянскага базару ў Віцебску» ўжо дастаўлены ў дырэкцыю Міжнароднага фестывалю мастацтваў з Мінска, дзе іх адлівалі па спецыяльным заказе.

Статуэткі зроблены з бронзы. Для пераможцаў Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2012» яны параўнальна большага памеру, чым для пераможцаў Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу. Гран-пры адрозніваецца, бадай, толькі гранітнай падстаўкай.

Распрацаваў прыз «Ліра», які ўручаюць на «Славянскім базары», пачынаючы з 2002 года, вядомы віцебскі скульптар Валерый Магучы. У прызе аб'яднаны сімвалы форуму мастацтваў: жанчына, якая спявае на фоне аркі Летняга амфітэатра і трымае ў руках залатую ліру. Вянчае кампазіцыю фестывальны васілёк.

«Горад майстроў» пераязджае

11 ліпеня ўпершыню ў новым віцебскім парку — Пераможцаў — адкрыецца традыцыйны «базарны» «Горад майстроў». Сёлета ён аб'ядноўвае каля 200 стваральнікаў шэдэўраў дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва, захавальнікаў традыцый народнай творчасці, умельцаў з усіх дамоў рамёстваў і клубаў раёнаў і гарадоў Віцебшчыны, а таксама прадстаўнікоў Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

«Задзвінскі кірмаш», дзе будуць прадстаўлены народныя рамёствы, пройдзе на ўсіх пляцоўках культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кальцо г. Віцебска «Дзвіна» (з 11 па 18 ліпеня). Шпацыр тут у гэтыя дні наўрад ці пакіне кагосьці абыякавым. У комплексе адбудзецца пленэр для разьбяроў па дрэве, у якім возьмуць удзел майстры з Польшчы, Расіі, Беларусі. Драўляныя скульптуры па выніках пленэру будуць устаноўлены на падворак «Дзвіны». Потым кавалі з усёй Беларусі збяруцца на кавальскі майстар-клас.

Тэатральныя сустрэчы

— Усе фестывальныя службы гатовыя да прыёму гасцей, а фестывальныя пляцоўкі чакаюць артыстаў і гледачоў! Я ўпэўнены, што гэтыя дзесяць ліпеньскіх дзён застануцца яркімі старонкамі ў гісторыі міжнароднага форуму, — кажа **Радзівон БАС, нязменны дырэктар фестывалю, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.** — Чакаецца, што па добрай традыцыі ва ўрачыстым адкрыцці фестывалю прыме ўдзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. У дні фестывалю на 11 пляцоўках пройдзе больш за 75 мерапрыемстваў. Тэатралаў арганізатары парадуюць сустрэчамі з любімымі артыстамі: Галінай Польскіх, Таццянай Краўчанка, Аляксеем Паніным, Расціславам Янкоўскім, Валянцінай Талызінай, Уладзімірам Кораневым і іншымі. Усяго ў праекце «Тэатральныя сустрэчы—2012» будзе прадстаўлена 9 спектакляў расійскіх, беларускага і латвійскага тэатраў.

Пяць мастацкіх фільмаў заяўлены ў фестывальнай кінапраграме. І асабіста прэзентаваць кожную карціну будуць яе стваральнікі — рэжысёры альбо акцёры.

Асвятляць мерапрыемствы прыедуць 460 прадстаўнікоў друкаваных і электронных СМІ, якія прадстаўляюць 15 краін свету. Дарэчы, дзякуючы журналістам «Славянскі базар у Віцебску» ведаюць ва ўсім свеце, высока цэняць і імкнуцца сюды патрапіць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

(Працяг тэмы на 6-й стар.)

■ ДА 150-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНКІ

«МЫ ЛЮБІМ СВАЮ ДЫСТАНЦЫЮ І ГАНАРЫМСЯ ЁЮ»

Чыгунка — асаблівая галіна эканомікі Рэспублікі Беларусь. Чыгуначны транспарт узаемадзейнічае з усімі галінамі народнай гаспадаркі, напрамую — з насельніцтвам краіны, прадпрыемствамі. Перад чыгункай стаяць адказныя задачы па своечасовым, якасным і поўным задавальненні патрэб народнай гаспадаркі ў перавозках грузаў, пасажыраў, пошты, багажу.

Беларуская чыгунка — вялікая гаспадарка. Яна ўключае 6 аддзяленняў: Брэсцкае, Магілёўскае, Віцебскае, Баранавіцкае, Гомельскае і самае вялікае — Мінскае, дзе працуе каля 20 000 чалавек. У структуру Мінскага аддзялення ўваходзіць і адасобленае структурнае падраздзяленне — транспартнае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі «МІНСКАЯ ДЫСТАНЦЫЯ ГРАМАДЗЯНСКІХ ЗБУДАВАННЯЎ», пра якое сёння і пойдзе наша гаворка. І пачнём гутарку, зразумела ж, з галоўным чалавекам прадпрыемства — начальнікам дыстанцыі Фёдарам КІРЭЕВЫМ.

Прадстаўляем суразмоўцу

Фёдар Мікалаевіч скончыў ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту па спецыяльнасці «Будаўніцтва чыгункі, пуць і пуцявая гаспадарка». Пачынаў сваю працоўную дзейнасць шафёрам. З 1981 года працуе на прадпрыемстве «Мінская дыстанцыя грамадзянскіх збудаванняў». Спачатку майстрам, потым прарабам, галоўным інжынерам, а з 1997-га ўзначальвае дыстанцыю.

За поспехі ў працы ўзнагароджаны знакам «Ганароваму чыгуначніку».

Начальнік Мінскай дыстанцыі грамадзянскіх збудаванняў Фёдар КІРЭЕЎ.

— Фёдар Мікалаевіч, раскажыце, калі ласка, чым займаецца ваша падраздзяленне, як яно развівалася.

— Мінская дыстанцыя грамадзянскіх збудаванняў перш за ўсё нясе адказнасць за стан будынкаў і збудаванняў. Асноўныя мэты дыстанцыі — своечасовае, якаснае абслугоўванне і рамонт (капітальны і бягучы) жыллёвага фонду, аб'ектаў камунальнай гаспадаркі, культурна-асветных і аздараўляльных устаноў, службова-тэхнічных будынкаў і збудаванняў Мінскага аддзялення чыгункі. А на балансе ў нас 414 жылых дамоў, 8 інтэрнатаў (3 з іх у Маладзечне), дзе пражываюць работнікі чыгункі, 358 службова-тэхнічных будынкаў, 309 іншых збудаванняў, 44 станцыі, 80 прыпыначных пунктаў, 237 пасажырскіх платформаў. А таксама 71 кацельня, лазня, аздараўляльны лагер імя М. Гастэла ў Зялёным, дзіцячая дача, Дом культуры чыгуначнікаў у Маладзечне (многія яго самадзейныя калектывы носяць званні «народнага» і «ўзорнага»).

Працягласць дыстанцыі абслугоўвання — 522 кіламетры.

Як развіваліся? Гісторыя нашай арганізацыі пачынаецца з 1936 года, калі на базе ўчастка нагляду-чыкаў збудаванняў у Мінску стварылі 5-ю жыллёва-рамонтную кантору Заходняй чыгункі. Тэхнічная ўзброенасць канторы была слабай: станкі прымітыўныя, старыя, адсутнічала аўтатэхніка, меліся толькі коні. Вядома ж, у такіх умовах немагчыма выконваць вялікі аб'ём працы. Каласальную шкоду жыллёва-камунальнай гаспадарцы нанесла і Вялікая Айчынная вайна. Потым былі аднаўленчыя работы. 1949 год праходзіў пад знакам завяршэння перабудовы канторы ў дыстанцыю будынкаў і збудаванняў, павелічэння рамонтна-будаўнічых аб'ёмаў, умацавання вытворчай базы. Сёння ў нас 3 прарабскія ўчасткі (два ў Мінску і адзін у Маладзечне), 7 участкаў інспектараў, якія абслугоўваюць вакзалы, пасажырскія платформы і прылеглыя тэхнічныя збудаванні, аварыйна-дыспетчарская служба, 4 ЖРЭУ, цэх механізацыі, сталярны цэх, дзе на сучасных станках вырабляем вокны, дзверы, цэх па падсобна-дапаможнай дзейнасці.

Калектыў у нас склаўся моцны, зладжаны. Шмат тых, хто працуе больш за 10 і нават 20 гадоў. Я вам так скажу: без добрага калектыву начальнік нічога не зробіць. Таму вялікі дзякуй людзям за працу. А я як кіраўнік дапамагаю, як магу.

— З якімі вынікамі падыходзіце да юбілею Беларускай чыгункі?

— Летась мы выйшлі на тыя паказчыкі, якія да нас даводзіліся. Агульны аб'ём рамонтна-будаўнічых работ складае 22,2 мільярда рублёў. Перавыконваем паказчыкі па энергазберажэнні. Калі сёлета ў І квартале даводзілася -9,5%, у нас ён — -9,6. Паказчык рэнтабельнасці складае 40,2%. Прадукцыйнасць працы ў параўнанні з леташняй павялічылася



Станцыя Беларусь.

ў тры разы. Сёлета ў нас у планах выкананне бягучага і капітальнага рамонту на 34,5 млрд рублёў.

Кіраўніцтва чыгункі падводзіць вынікі нашай працы два разы на год — восенню і вясной робяцца аб'езды начальніка Беларускай чыгункі. На апошнім, вясновым, аб'ездзе камісія дала нармальную ацэнку нашай гатоўнасці да летніх перавозак.

Акрамя ўсяго, мы актыўна працуем са зваротамі грамадзян, імкнёмся задавальняць іх патрэбы, жыць іх праблемамі. Магчыма, таму сёлета зваротаў было на 40 % менш.

Не шкодзь — мы ўсё бачым

— Участак адказнасці ў нас вялікі. Абслугоўваем станцыі, тэхнічныя збудаванні ў 4 кірунках: Маскоўскім (да Чырвонага Сцяга), Брэсцкім (да Энергетыка), Маладзечанскім (да мяжы з Прыбалтыкай), Асіповіцкім (да Талькі), — далучаецца да нашай размовы **намеснік начальніка дыстанцыі па ідэалагічнай працы, кадрах і сацыяльных пытаннях Сяргей КАСЬЯНАЎ.** — Нашы аб'екты раскіданы па абласцях (Мінская, Гродзенская, Віцебская), таму характар працы раз'язны — а гэта заўсёды кантакты з адміністрацыямі раёнаў, аддзеламі архітэктуры, цэнтрамі гігіены, землеўпарадкавальнымі службамі і г.д.

Мы бралі ўдзел ва ўводзе ў дзеянне новага праекта, які не мае аналагаў сярод краін СНД — «Гарадская электрычка»: запусцілі першую электрычку Мінск-Пасажырскі—Беларусь.

Сёння займаемся абсталяваннем станцыі Баброўнікі на Астравечыне, у раёне будаўніцтва АЭС.

Акрамя задач па ўтрыманні ў належным тэхнічным і эстэтычным стане збудаванняў, ёсць у нас і шэраг іншых. Адна з іх — перадача жыллёвага фонду мясцовым Саветам, таму што чыгунка перш за ўсё павінна займацца бяспекай перавозак пасажыраў і грузаў. Распрацавана праграма развіцця чыгуначнага транспарту, згодна з якой да 2015 года мы павінны ўвесь жыллёвы фонд перадаць мясцовым Саветам. Ужо перададзена больш за 300 тысяч кв.м, яшчэ каля 200 тысяч застаецца на абслугоўванні.

Адзін з сур'ёзных кірункаў працы — рэгістрацыя будынкаў і збудаванняў. Да канца 2014 г. мы павінны зарэгістраваць усе — а іх у нас каля тысячы. На 70% мы ўжо выканалі гэтую задачу. Загваздка бывае ў тым, што некаторым будынкам па 100 гадоў (у асноўным гэта жылыя дамы па лініі чыгункі; напрыклад, ва УП «Весялоўскі» — 2 жылыя дамы 1870 года пабудовы; у цэнтры Мінска па вул. Кірава — 2 такія дамы). Тэхнічная дакументацыя на іх фактычна не захавалася, таму працэдура рэгістрацыі больш складаная. 12 будынкаў маюць статус помнікаў архітэктуры, і ёсць пэўны парадак іх утрымання.

Рэгістрацыя зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў нашым падпарадкаванні, падтрыманне парадку на гэтай зямлі — таксама задача сур'ёзная. Для падтрымання належнага санітарнага стану створаны спецыяльны ўчастак па ўтрыманні станцыйных тэрыторый, дзе працуе каля 100 чалавек, якія сёлета ўведзены ў наш штат. На станцыях мы пачынаем устанаўліваць камеры відэаназірання. Напрыклад, у Ждановічах яна ўжо ёсць. У планах — абсталяваць імі яшчэ пяць станцый, на што выдаткавана каля 400 млн рублёў. Дзякуючы камерам ужо затрымалі чатырох парушальнікаў правапарадку.

Клопат пра калектыў

Пра тое, як ствараецца здаровы мікраклімат на прадпрыемстве, расказвае **старшыня прафсаюзнага камітэта дыстанцыі Юзэфа САВІЦКАЯ:**

— Адзін раз на тры гады мы прымаем калектыўны дагавор, у якім прапісваем, напрыклад, надбаўкі за выслугу, матэрыяльную дапамогу, што аказваецца супрацоўнікам пры нараджэнні дзіцяці, уступленні ў шлюб, а таксама ветэранам. У нас ёсць Савет ветэранаў, добраахвотная дружына. Дарэчы, наша дружына пастаянна займае прызавыя месцы па аддзяленні і нават па рэспубліцы. Лепшы камандзір добраахвотнай дружыны — Людміла Саковіч, яна і мужа (таксама супрацоўніка дыстанцыі) прыцягнула да дзяжурстваў.

Дзейнічаюць на прадпрыемстве савет прафілактыкі п'янства, штаб па папярэджанні карупцыйных правапарушэнняў, штаб па выкананні прэзідэнцкіх дырэктыў.

Лічым, што вельмі важна стварыць для людзей утульныя ўмовы працы. Сваёй сталовай у нас няма, ды і адкрыць яе практычна немагчыма з-за раз'яднога характару працы. Але ёсць бытавыя памяшканні, якія аснашчаны электрачайнікамі, мікрахвалевымі печкамі. Працуем над тым, каб усё ж забяспечваць людзей гарачым харчаваннем. Магчыма, гэта будуць карткі на харчаванне.

Усе працоўныя месцы аснашчаны неабходным абсталяваннем, аргтэхнікай. Сярэдняя зарплата па дыстанцыі — 4,3 млн руб., высокакваліфікаваныя спецыялісты атрымліваюць каля 5,2 млн руб.

У нашых інтэрнатах пражывае каля 3 000 працаўнікоў чыгункі. Там працуюць педагогі-арганізатары, выхавальнікі, якія ладзяць з дзецьмі і дарослымі розныя мерапрыемствы. Адно з іх было прысвечана якраз 150-годдзю Беларускай чыгункі. Ёсць разнастайныя гурткі, трэнажорная зала.

Вялікая праца праводзіцца па аздараўленні супрацоўнікаў і іх дзяцей. Вядзяляем пуцёўкі ў свой, чыгуначны, аздараўляльны цэнтр «Талька». Ёсць

Калектыў планава-эканамічнага аддзела.

магчымасць адпачыць і ў санаторыях краіны. У летні перыяд аздараўліваем дзяцей у лагеры імя М. Гастэлы (заснаваны ў 1954-м, у наступным годзе будзем адзначаць яго 60-годдзе). На працягу многіх гадоў лагер займае прызавыя месцы не толькі ў Мінску, але і па ўсёй рэспубліцы. Ён забяспечаны неабходным інвентаром, новым кухонным абсталяваннем: гэта пліты з параканвеныатаматамі, пасудамыйная машына, ёсць фільтр па абезжалезванні вады. Харчаванне ў дзяцей рацыянальнае і добра збалансаванае, 6-разовае — чыгунка кожны год выдзяляе на яго ўласныя сродкі. Летась лагер стаў пераможцам рэспубліканскага агляду-конкурсу «Здаровае харчаванне — здаровае дзіця» ў намінацыі «Лепшая арганізацыя харчавання ў аздараўляльным лагеры». Адпраўляем дзетак і ў лагер «Меркурый» (на моры).

Старшыня прафсаюзнага камітэта дыстанцыі Юзэфа САВІЦКАЯ.

Вялікую ўвагу надаём культурнаму адпачынку супрацоўнікаў. Штогод ладзяцца святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню чыгуначніка, традыцыйным святам. Выязджаем на экскурсіі. Асабліва спадабаліся маршруты «Гродна — Аўгустоўскі канал», у Полацк, на «Лінію Сталіна». Пастаянна закупляюцца білеты ў тэатры, цырк, на канцэрты. Вялікая ўвага надаецца таксама спорту. У Мінскім аддзяленні 24 спартыўныя каманды па ўсіх відах спорту, і наша каманда, ад дыстанцыі, займае 6 месца сярод іх. А нашы лыжнікі, напрыклад, займалі прызавыя месцы ў «Мінскай лыжні» ў Раўбічах. Акрамя таго, праводзім для супрацоўнікаў турыстычныя злёты. Летась такі злёт адбыўся на беразе Нёмана. Спартыўныя спаборніцтвы, узнагароджанне, вогнішча, гітара... Гэта вельмі падабаецца супрацоўнікам, згуртоўвае іх. Сёлета на базе лагера імя М. Гастэлы ў лютым мы правялі і зімовую спартакіяду.

Распрацавана пагадненне аб прэміраванні лепшых работнікаў дыстанцыі. Сярод іх — Дзмітрый Рэут, Васіль Джыга, Ігар Грачуха, Аляксандр Жукаў, Аляксандр Дзедух, Галіна Ахрэмчык, Уладзімір Левановіч, Васіль Дзяруга, Уладзімір Крывашэеў, Аляксандр Ляўша, Міхаіл Стэфаноўскі, Галіна Фіясь, Таццяна Быстрова, Алена Філіповіч і іншыя.

***

Карыстаючыся выпадкам, нашы суразмоўцы пажадалі ўсім чыгуначнікам плёну ў працы, моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту. А таксама годна сустрэць 150-гадовы юбілей Беларускай чыгункі.

Публікацыю падрыхтавала Святлана ТАРАСЕВІЧ.
Фота з архіва прадпрыемства.

УНП 100026621.

Калектыў бухгалтэрыі.

Калектыў вытворча-тэхнічнага аддзела.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырьдрев» (продавец)

извещает о проведении 13 августа 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи лота, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Циклон УЦ-2000/3 с зонтом (инв. № 41890)	г. Мозырь, ул. Гоголя, 61; г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120	18 620 640	1 800 000
2	Циклон УЦ-2000/3 с зонтом (инв. № 41889)		18 620 640	1 800 100
3	Циклон УЦ-2000/3 с зонтом (инв. № 41890)		18 620 640	1 800 200
4	Циклон УЦ-2000/3 с зонтом (инв. № 41890)		18 620 640	1 800 300
5	Циклон УЦ-2000/3 с зонтом (инв. № 41890)		18 620 640	1 800 400
6	Камаз 5320 гос. № ЕВ 6203 (инв. № 3428)		81 274 200	8 100 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырьдрев», 247760, г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120. Решением хозяйственного суда Гомельской области от 01.11.2010 в отношении ОАО «Мозырьдрев» открыто ликвидационное производство, телефоны: 8 0236 35 60 28; 8 0236 35 66 01.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (должника) (Открытое акционерное общество «Мозырьдрев») р/с 3012002731231 филиал № 317 ОАО «Беларусбанк» в г. Мозыре, МФО 151501678, УНП 400088836 по 9 августа 2012 года до 17.00.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по 9 августа 2012 до 17.00.

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, Методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) №144 от 29.11.2010.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырьдрев» (продавец)

извещает о проведении 26 июля 2012 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи лота, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
